ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ і ГАРПРАФБЮРО.

КОШТ НУМАРУ Ў ГОРАДЗЕ І АКРУЗЕ 5 КАП.

РЭДАКЦЫЯ: Палац працы, 3-ці паверх, пак. 39, 40, 41, 43. Тэлеф. агульны 2-85, „ рэдактара 1-73, „ сакрат. і к-ры 72.

Падпісная цана ў месяц 80 кап. Плата за абвесткі: За радок петыту . . . 30 кап. Для іншагародніх . . . 40 кап. Пры шматразовым друкаванні скідка па згодзе.

Год выданьня 13-ты.

№ 235 || Пятніца, 10 кастрычніка 1930 г. || № 235

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА З ПАБУДОВЫ ШВЭЙНАЙ ФАБРЫКІ № 2, за 9-е кастрычніка 1930 года

Праф'ячэйкі стройкі не павярнуліся тварам да будаўніцтва. Рабочая маса не мабілізавана вакол канкрэтных задач будаўніцтва і пуска фабрыкі. Масавая работа адсутнічае. Работа вядзецца ня ўдарнымі тэмпамі. З усіх шчылін сквазіць правы апартунізм. Многа лжэ-ударнікаў. Барацьбы з імі ніякай не вядзецца. Тэрмінова неабходна мабілізацыя рабочых мас і спэцыялістых. Неабходна па паасобных аб'ектах работ стварыць паасобныя рабочыя ўдарныя брыгады. Неабходна аб'яднаная рабочая канфэрэнцыя сумесна з інжынэрна-тэхнічным пэрсаналам—рабочых будаўнікоў, рабочых швэйнікаў фабрыкі «Прафінтэрн» для сумеснага вырашэньня ўсіх задач, стаячых перад пускам фабрыкі.

Неабходна на ўсіх зьвеньнях і вучастках забясьпечыць партыйнае кіраўніцтва. Задача ўсіх арганізацый і рабочых фабрыкі «Прафінтэрн»—барацьба за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляна за квартал кастрычнік—сьнежань і за пуск фабрыкі.

Вадаправодныя трубы з Ленінграда прыбылі, справа за Віцкамтрэстам. Тав. Сухаручкін згадзіўся прыняць на сябе вырашэньне і кіраўніцтва пытаньнем вадаснабжэньня фабрыкі, астатнія работы не пераключаны на ўдарныя бальшавіцкія тэмпы.

Па-ўдарнаму змагацца за пуск фабрыкі!

УСЕ СІЛЫ ПРАЛЕТАРСКАГА ГОРАДУ НА ДАПАМОГУ КАЛГАСАМ І САЎГАСАМ ПА ЎБОРЦЫ БУЛЬБЫ І ЛЁНУ

Рабочыя, жонкі рабочых, студэнцтва, арганізуйце дабрахвотныя брыгады па ўборцы колгасных палёў!

Калгасьнікі, шырэй разгортвайце сацспаборніцтва і ўдарніцтва!

Ударны 10-дзёньнік пралетарскай дапамогі калгасам і саўгасам скарыстаем для ўзмацненьня падрыхтоўкі да дню калектывізацыі і ўраджаю, для забесьпячэньня магутнага прыліву беднаты і серадняку ў калгасы, для нанясеньня руйнуючага ўдару па кулаку

Скарыстаць кожную хвіліну!

У раёнах былой Віцебскай акругі на палёх саўгасаў і калгасаў яшчэ да гэтага часу застаецца шмат няўбраных га бульбы, яшчэ ёсьць няўбраныя палосы лёну, таксама стаяць няўбранымі сады. Пагоршываецца надвор'е, наступіўшае пахаладаньне—прымушае біць трывогу. Цяжкое становішча з уборкай высоўвае перад пралетарскім горадам баявую задачу—тэрмінова і максымальна мабілізаваць усе свае сілы і кінуць іх на дапамогу калгасам і саўгасам па ўборцы ўраджаю.

Гарадзкі камітэт партыі 8 га кастрычніка на паседжаньні бюро вынес пастанову аб правядзеньні **з 10 па 20 кастрычніка ўдарнага 10-дзёньніка** пралетарскай дапамогі калгасам і саўгасам па ўборцы бульбы, лёну і яблык. Перад партыйнымі, камсамольскімі і прафсаюзнымі арганізацыямі бюро гаркому паставіла задачу максымальнай мабілізацыі ўвагі мас на неабходнасьць пралетарскай дапамогі саўгасам і калгасам па ўборцы ўраджаю. Такая-ж задача стаіць перад студэнцтвам і жактамі. Склаўшаяся абстаноўка, якая ставіць пад пагрозу надзвычайна добры ўраджай бульбы і лёну, а таксама ўраджай яблык, патрабуе ад кожнага члена прафсаюза безадкладнай дабрахвотнай мабілізацыі, стварэньня ўдарных дабрахвотных брыгад, усямернага разгортваньня сацспаборніцтва га ажыцьцяўленьню канкрэтнай пралетарскай дапамогі сацыялістычнаму сэктару вёскі.

Пасьпяховае правядзеньне 10-дзёньніка, поўная ўборка калгасных палёў зьяўляецца часткай той вялічэзнай барацьбы, якую пад кіраўніцтвам партыі праводзіць рабочая кляса за прамфінплян, за пяцігодку. Бульба зьяўляецца важным сродкам рабочага забесьпячэньня. Поўнае забесьпячэньне пралетарскіх цэнтраў бульбай—адказьнейшая і баявая задача дню. Ільноволакно і ільносемя патрэбна нашым фабрыкам і заводам. Убраць усю бульбу, адгрузіць яе пралетарскім цэнтрам, убраць лён, г. зн. атрымаць вялікую перамогу на фронце барацьбы за прамфінплян.

Але-ж, ёсьць і другі надзвычайна важны бок у гэтай справе. Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыі, дзякуючы пралетарскай дапамозе вёсцы ў калгасным будаўніцтве,—вясна бягучага году дала значны рост калгасаў. Арганізацыйнае замацаваньне калгасаў, іх гаспадарчы рост, відавочная пераважнасьць калгаснага жыцьця ў параўнаньні з жыцьцём аднаасобніка, ажыцьцяўленьне ленінскіх дырэктыў партыі аб узаемаадносінах калгасьнікаў з адзіноасобнікамі забясьпечваюць новы прыліў беднаты і серадняцтва ў калгасы. Кулак імкнецца ўсімі мерамі перашкодзіць калгаснаму будаўніцтву—і шляхам шкоднай агітацыі, і шляхам падрыўной работы, і нахабных выпадаў супроць калгасаў. Пасьпяховай уборкай ураджаю, уборкай кожнага каліва бульбы, арганізацыяй ударнай працы ў дні 10-дзёньніка, шырокім растлумачэньнем задач дню калектывізацыі і ўраджаю, пралетарыі гораду павінны забясьпечыць яшчэ больш магутны калгасны прыбой, яшчэ больш руйнуючы ўдар па кулаку, паскорыць ліквідацыю кулацтва як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Шэраг калгасаў па-баявому мабілізаваліся на ўборку палёў і правялі яе поўнасьцю. Спазьненьне з уборкай у значнай частцы тлумачыцца тым, што некаторыя з кіраўнікоў калгасаў нядбайна аднесьліся да ўборкі бульбы, казалі: «нам асабліва нямa чаго напіраць, часу яшчэ хапае». Сёньня перад калгасьнікамі стаіць задача па прыкладу пралетарскага горада мабілізаваць свае сілы, разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва з тым, каб на працягу 10-дзёньніка поўнасьцю ўбраць калгасныя палі.

Марудзіць нельга. Кожная дарэмна патрачаная хвіліна — злачынства. Трэба павялічыць пільнасьць і грамадзкі кантроль над ўсёй працай па ўборцы і адгрузцы бульбы, па ўборцы і загатоўцы лёну і яблык. Трэба бязьлітасна выкрываць усіх нядбайна адносячыхся да гэтай важнейшай справы, а таксама перашкаджаючых і зрываючых баявыя тэмпы.

Магутны напор творчай ініцыятывы і энэргіі пралетарскага гораду на калгасныя палі! Ніводнага каліва неўбранай бульбы! Ударным 10-дзёньнікам забясьпечым далейшае шпаркае разгортваньне калгаснага руху!

Гарпрафсавет мабілізуе 150 рабочых ад 25 прадпрыемстваў для накіраваньня ў дапамогу калгасам.

З 10-га па 20-е кастрычніка—ударны дзесяцідзёньнік пралетарскай дапамогі калгасам і саўгасам

Пастанова бюро Гаркому КП(б)Б

У сувязі з крайне цяжкім становішчам па ўборцы ўраджаю ў калгасах і саўгасах па ўсіх сельскіх раёнах былой Віцебскай акругі, бюро Гаркому пастанаўляе:

1. Правесьці ўдарны дзесяцідзёньнік з 10 па 20 кастрычніка па ўборцы ўраджаю і пралетарскай дапамозе гораду калгасам і саўгасам.

2. Прапанаваць фракцыі Гарпрафсавету неадкладна мабілізаваць неабходную колькасьць членаў прафсаюзаў на ўборку ўраджаю.

3 Фракцыі Гарпрафсавету, калектывам і ячэйкам КП(б)Б разгарнуць масавую палітычную кампанію сярод рабочых прадпрыемстваў і служачых установаў аб правядзеньні дабрахвотнай дапамогі па ўборцы ўраджаю ў калгасах і саўгасах.

4. Прапанаваць газ. „Віцебскі Пралетары" выпусьціць спэцыяльную лістоўку, прысьвечаную правядзеньню 10-дзёньніка пралетарскай дапамогі горада вёсцы.

Дапамога пралетарскага гораду

Гарадзкім штабам па ўборцы гародніны накіроўваюцца на ўборку гародніны на 5 дзён у калгасы былой Віцебскай акругі і прыгарадныя гаспадаркі ЦРК:

У Лёзна—375 чал., у Віцебскі раён—250 чал., у Гарадоцкі раён—150 чал., у Высачаны—150 чал., у Бешанковічы—75 чал., у Сіроцінскі раён—150 чал., у Сураскі раён—100 чал. У прыгарадныя гаспадаркі ЦРК—300 чал.

Да ўсіх прафарганізацый і членаў прафсаюзаў

Зварот Гарпрафсавету

Становішча забясьпечаньня рабочых гародніной—пад пагрозай з прычыны адсутнасьці рабочых рук па ўборцы гародніны.

Надвор'е прымушае нас у самым неадкладным баявым парадку дапамагчы саўгасам і калгасам своячасова ўбраць гародніну і накіраваць яе ў рабочыя цэнтры.

Віцебскі Гарпрафсавет зварочваецца да ўсіх рабочых і служачых гораду з заклікам аб дабрахвотнай дапамозе па ўборцы.

З свайго боку Гарпрафсавет у абавязковым парадку мабілізуе 300 членаў саюзаў на тэрмін ня менш як на 10 дзён.

Праф'ячэйкам на мясцох узьняць грамадзкую думку вакол своячасовай уборкі гародніны і прыняць актыўны ўдзел у гэтай мабілізацыі.

Саўгасам і калгасам патрэбна пралетарская дапамога, якую мы ў самы найхутчэйшы час павінны аказаць.

Прафарганізацыі і жакты мабілізуйце ўвагу рабочых, служачых і іх сем'яў на ўборку ўраджаю ў прыгарадных гаспадарках, саўгасах і калгасах.

Арганізуем камсамольскі эшалон

Па ініцыятыве калектыву камсамолу МБВ чыгункі арганізуецца чырвоны камсамольскі эшалон бульбы імя IX зьезду УсеЛКСМ, па маршруту Віцебск—Масква.

Уся работа па арганізацыі эшалону праводзіцца камсамольцамі гарадзкой і віцебскай раённай арганізацыі пры дапамозе партыйнай арганізацыі і інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў чыгункі.

Камсамольцы Віцебшчыны адпраўляюць к 25 кастрычніка для пралетарыяў чырвонай сталіцы 70 вагонаў бульбы.

Абраны для кіраўніцтва арганізацыяй эшалону гарадзкі штаб **абвясьціў мабілізаванымі гарадзкую і раённую камсамольскія арганізацыі.**

Ствараюцца ўдарныя брыгады з камсамольцаў, якія накіроўваюцца ў саўгасы і калгасы Віцебскага раёну для ўборкі бульбы. Таксама накіроўваюцца брыгады для правядзеньня сходаў адзіналічнікаў па бульбанарыхтоўках. Пагрузка будзе вытвараца таксама сіламі камсамольцаў.

Камсамольцы — чыгуначніці ўдарным парадкам у звышурочны час рамантуюць паравоз з бягучага рамонту.

Уся цягніковая брыгада складаецца з камсамольцаў. Паравозная брыгада едзе ў лзьве асобы. Тэхнічны пэрсанал зараз прымае меры к таму, каб эшалон з бульбай і дэлегацыяй ад віцебскага камсамолу прыбыў бы у Маскву бяз усякага затрыманьня.

М. Сабецкі.

Мабілізаваны 360 чалавек

8-га кастрычніка сумесна з старшынямі 9-ці мясцкомаў адбылося паседжаньне штабу па ўборцы гародніны пры Гарпрафсавеце.

Старшыня Гарпрафсавету тав. Каралёў адзначыў, што становішча з уборкай бульбы і садавіны па некаторых калгасах былой Віцебскай акругі кепскае.

Штаб пастанавіў мабілізаваць на 10 дзён па ўборцы бульбы і садавіны: ЦРК—140 чал., інв. арцеляў—100 чал., саюзу сувязі—20 чал., Гарсавету—12 чал., камітэту ўзаемадапамогі—12 чал., дзяржбанку—8 чал., ашчадкас—12 чал., міліцыі—10 чал., саюзу рабіс—5 чал., саюзу нарпіт—20 чал., Белпайганглю—4 чал. Акрамя таго, ад камсамолу гораду—20 чал.

Ніводнага каліва бульбы не павінна застацца на полі

У Віцебскім раёне справа з уборкай бульбы абстаіць вельмі небясьпечна. Вельмі нямногія калгасы справіліся з задачай. Толькі ў калгасе **«Новае жыцьцё»** і ў калгасе **«імя Сталіна»**, Астровенскага сельсавета, убрана ўжо ўся бульба. У калгасе **«Бяроза»** засталося 1 га. У калгасе **«Капачова»** засталося 2 га, у калгасе **Маркавічы** 3 га ня ўбранай бульбы. Вядома, што гэтыя калгасы сваімі сіламі справяцца з уборкай.

Поруч з гэтым, якраз у найбольш буйных калгасах застаецца яшчэ няўбранай шмат бульбы. У калгасе «імя Сталіна», Машканскага сельсавета, ня ўбрана 70 га, у калгасе «1-е мая»—35 га, у калгасе «Чырвоны Пуціловец», Астровенскага сельсавету—25 га. У калгасе «Добрына" ня ўбрана 20 га бульбы і 15 га караньплодаў. Таксама ёсьць калгасы, у якіх засталося няўбранымі да 15 га бульбы, як: Замасточча, „Прагрэс".

Наогул-жа, па Віцебскаму раёну ўбрана толькі 30 проц. бульбы. Пасылка брыгад на ўборку з горада зараз у сувязі з дрэнным надвор'ем некалькі прыпынілася.

Пры агульнай мабілізацыі ўсяго раённага актыву, пры дружнай дапамозе пралетарыяў горада бульба можа быць пасьпяхова ўбрана.

Ніводнага каліва бульбы не павінна застацца на полі.

Калгасьнік.

Па ўсіх пытаньнях аб пасылцы на ўборку бульбы трэба зварочвацца ў штаб па ўборцы гародніны — Палац працы, пакой 20, тэлефон 45.

Галавацяпы з ЦРК затрымліваюць чырвоныя абозы

Калі калгасьнікі, беднякі і сераднякі Віцебскага раёну адгукнуліся на заклік пралетарыяў, арганізоўваючы чырвоныя абозы бульбы, дык галавацяпы, каб не казаць больш, з Віцебскага ЦРК ужылі ўсе меры да таго, каб затрымаць своячасовую здачу бульбы.

Райспажыўсаюз даўмовіўся з членам праўленьня ЦРК т. Кутаем аб тым, па якіх складах будзе разьмяркоўвацца бульба; калі-ж сяляне прывезьлі ў дзень «ударніка» 1-га кастрычніка, бульбу, усе вызначаныя склады аказаліся на замку. Загадчыкі лавак ЦРК рашуча адмовіліся прымаць бульбу і сяляне блыталіся па гораду каля 6-ці гадзін, здаючы бульбу па складах каапсаюзу, па некалькі мяшкоў у крамы ЦРК і г. д.

Такі-ж выпадак здарыўся і 5 га кастрычніка, у нядзелю, калі сяляне таксама прывезьлі ў горад чырвоныя абозы бульбы.

Вось некалькі прыкладаў, як сустракалі сялян: загадчык складам № 76 гаварыў сялянам-чырвонаабозьнікам, якія прывезьлі бульбу: «Што я штаны зьніму і буду туды бульбу сыпаць»?, у той час, калі ў складзе было вольнае памяшканьне і магчыма было-б прыняць шмат бульбы. Загадчык складам гародніны Шубік таксама адмовіўся прымаць бульбу. У магазыне ЦРК № 43 адмовіліся ад прыёму бульбы, хаця бульбы зусім ня было і прыходзячыя рабочыя атрымсўвалі адказ: «бульбы няма». Пасьля доўгіх спрэчак у гэтым магазыне было прынята 30 падвод бульбы.

Прыведзеныя факты гавораць самі за сабе. Гэтыя абураючыя выпадкі павінны быць тэрмінова расьсьледваны і вінаватыя сурова пакараны.

М. С.

Гародніна ў калгасах „1-е мая" і імя Чярвякова на полі

Становішча з уборкай гародніны, асабліва бульбы, ураджай якой сёлета надзвычайна вялікі, цяжкое. Шмат бульбы ў калгасах дагэтуль застаецца на полі.

Раённыя арганізацыі праспалі ўборку гародніны і несваечасова завастрылі на гэтым увагу грамадзкасьці.

У калгасе імя **«1-га мая»**, у Старым Сяле, Віцебскага раёну, з пасаджаных 55 га бульбы выкапана ўсяго толькі... 15 га і тая ляжыць пад саломай на полі. **40 га дагэтуль ляжыць у зямлі** пры дажджлівым надвор'і. Апрача астатняй гародніны, як капуста, буракі на карані, сёньня стаіць яшчэ 15-га сена.

У калгасе імя Чярвякова ня выкапана дагэтуль 4 га бульбы. Крыху лепш абстаіць справа ў калгасе Бяроза, дзе засталося ў зямлі 3 га.

Конанаў.

ФЗВ мэталістаў наміроўвае на дапамогу калгасам па ўборцы бульбы 200 чал.

А. Сталевіч

Беларускія нацыянал-дэмакраты—рэалізатары „усходняй палітыкі" польскага імпэрыялізму*)

III

У сваёй запальчывай асьцервянелай клясавай барацьбе кулак і нэпман у БССР ускладаюць вялікія надзеі на дапамогу і працягваюць рукі да заходня-беларускай буржуазеі і верхавіны дробнай буржуазеі, да ўсяго фашысцкага лягеру Польшчы. Было-б грубай, шкоднай памылкай не даацэньваць **адзінства і наардынацыі работы, палітычнай і арганізацыйнай сувязі беларускай контр-рэвалюцыі па абодвых баіох польска-савецкай мяжы і** недаацэньваць небясьпекі, якая выцякае адгэтуль. Заходня-беларуская буржуазея і кулацтва кроўна зацікаўлены ў падтрыманьні і захаваньні сваёй апоры і саюзьніка на грунце БССР—кулацтва і нэпманства. Яна ўсямерна падтрымоўвае, садзейнічае і кіруе анты-савецкай контр-рэвалюцыйнай барацьбой у БССР.

Буржуазея Заходняй Беларусі, такім чынам, праводзячы ў жыцьцё усходнюю палітыку фашызму, мае ад яго поўнае матар'яльнае і палітычнае падтрыманьне. Аднак, было-б памылковым зводзіць ролю беларускіх эксплёататарскіх клясаў толькі да ролі агентаў польскай фашысцкай дыктатуры.

Такі погляд прывёў бы да неразуменьня і недаацэнкі распластаваньня ў беларускім грамадзтве і сапраўднай ролі беларускай буржуазеі ў барацьбе супроць рэвалюцыйнага руху рабочых і сялян на З. Б. і іх ролі ў падрыхтоўцы вайны супроць СССР. Беларуская буржуазея, ідучы пад камандай польскага і міжнароднага імпэрыялізму, набірае яшчэ большай антысавецкай агрэсыўнасьці ў сілу яшчэ і сваіх спэцыфічных задач,—задач, якія наогул і ў цэлым ідуць па лініі дамаганьняў пануючых эксплёататарскіх клясаў усёй Польшчы.

Беларуская буржуазея і яе палітычныя партыі, уваходзячы ў агульны польска-фашысцкі лягер, мае свае ўласныя інтарэсы—паміж беларускімі эксплёататарскімі клясамі і гэткімі-ж польскімі існуюць свае спрэчкі і цярці, якія завастраюцца асабліва цяпер на грунце паглыбляючагася эканамічнага крызісу ў Польшчы. Аднак **спрэчкі гэтыя зьяўляюцца сямейнымі непаладкамі ўнутры фашысцкага лягеру, ня выходзяць з рамак буржуазнае клясы і ўзьнікаюць на грунце большай-меншай долі ў эксплёатацыі працоўных мас Заходняй Беларусі, за ўдзеле грабніжніцкага гаспадараньня багацтвамі краю, у падзеле скуры мядзьведзя, якога не забілі, а менавіта, БССР.**

Заходняя беларуская буржуазея, дзякуючы сацыяльнай і эканамічнай пылітыцы польскай фашысцкай дыктатуры, за кошт эксплёатацыі руіны працоўных мас, гаспадарча ўзмацнела, асабліва пасьля майскага фашысцкага перавароту. Мэтады фашысцкага ліквідаваньня фэадальных перажыткаў, як сэрвітуты, праспалосіца і інш., абшарніцка-кулацкая крэдытовая палітыка фашысцкага ўраду садзейнічалі шпарчэйшаму капіталістычнаму разьвіцьцю буйнай і кулацкай сельскай гасп. і ў некаторай меры пераходу з натуральнай у таварную гаспадарку. Сьведчаць гэтаму ніжэйпададзеныя паказчыкі: у 1909-13 годзе на тэрыторыі сучаснай Заходняй Беларусі было засеяна пад ільном 36.800 га, а ў 1925—29 годзе—78400 га; караньплодаў засеяна ў 1909—13 г.—404.900 га, у 1925—29 г. засеяна—505.800 га. І гэта ў той час, калі агульная пасеўная плошча Заходняй Беларусі не дасягнула даваеннага ўзроўню: 2.896.700 га і 2.868.000 га ў той-жа параўнальны час. Развіцьцё тэхнічных культур і кораньплодаў, як для Заходняй Беларусі досыць значнае, відавочна паказвае зрастаньне фінансавага капіталу з капіталам аграрным, паказвае значнае разьвіцьцё капіталістычных форм эксплёатацыі, сьведчыць аб глыбокай дыфэрэнцыяцыі і абвастрэньні клясавай барацьбы на вёсцы Заходняй Беларусі.

У выніку гэтага працэсу, паміма цярцёў і таргоў беларуская буржуазея арганічна зраслася з лягерам польскага фашызму, актыўна супрацоўнічае з ім у рэалізацыі ўсёй палітыкі фашысцкага ўраду, ураду голаду, эксплёатацыі, беспрацоўя і вайны. Супрацоўніцтва гэта ідзе па трох галоўных лініях.

Першым чынам, супрацоўніцтва паміж польскай і беларускай буржуазеі адбываецца на грунце рэалізацыі сацыяльна-эканамічнай палітыкі польскага фашысцкага ўраду. Фашысцкая палітыка на Заходняй Беларусі, маючы выразна калёніяльны характар, ідзе на ўзмацненьне мясцовай буржуазеі—польскай, беларускай, яўрэйскай і літоўскай за кошт узмацненьня эксплёатацыі пралетарыяту, павялічэньня падатковага цяжару на асноўныя працоўныя масы сялянства.

Далей, поўнае супрацоўніцтва ідзе пры барацьбе супроць рэвалюцыйнага руху рабочых і працоўнага сялянства, супроць нацыянальна-вызваленчай барацьбы працоўных мас Зах. Беларусі. Толькі фашысцкая дыктатура капіталістаў, абшарнікаў і кулакоў зьяўляецца сапраўдным ратаўнікам і апякуном беларускай буржуазеі ад надыходу пралетарскай рэвалюцыі, яна адзіная сіла, якая ня толькі захоўвае клясавае панаваньне беларускай буржуазеі, але падае надзеі, што пры садзейнічаньні фашысцкай дыктатуры можна будзе пашырыць сваё панаваньне і на БССР.

Аднак, галоўнае супрацоўніцтва беларускай буржуазеі з польскім фашызмам **ідзе цяпер па лініі падрыхтоўкі і непасрэднай арганізацыі вайны супроць Савецкага Саюзу.** Беларуская буржуазея па абодвух бакох польска-савецкай мяжы страціла надзею на буржуазнае перараджэньне Савецкай Беларусі, на стварэньне Беларускай народнай рэспублікі «мірным шляхам». Наадварот, яна бача, што посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР з кожным годам усё больш маюць рэвалюцыянізуючае значэньне для працоўных мас Заходняй Беларусі, усё больш пагражаюць яе панаваньню нават і на Заходняй Беларусі. Апроч таго, ліквідацыя ў БССР кулацтва, як клясы, ушчэнт падрывае работу беларускіх контр-рэвалюцыйных сіл у справе рэстаўрацыі капіталізму. **Цяпер беларуская буржуазея бачыць адзіны шлях устанаўленьня свайго буржуазнага панаваньня на землях Савецкай Беларусі толькі шляхам узброенай інтэрвэнцыі пры дапамозе і кіраўніцтве польскага імпэрыялізму.**

Рэч бясспрэчная, што кіраўнічая роля ва ўсёй беларускай контр-рэвалюцыі, як на Заходняй Беларусі, так і ў БССР, а таксама на латыскай частцы беларускіх зямель і сярод беларускай белай эміграцыі, належыць да беларускай буржуазеі і яе палітычных партый на Зах. Беларусі. Адгэтуль і львіная доля па рэалізацыі ўсходняй палітыкі польскай фашысцкай дыктатуры ляжыць на беларускім контр-рэвалюцыйным лягеры ў Заходняй Беларусі, на беларускіх нацыянал-фашыстах на чале з Луцкевічам.

У сваім дэфэнзыўскім сьвістку «Наперад» Луцкевіч так выкладае ваенную захопную праграму беларускага нацыянал-фашызму: «На ўсходніх рубяжох сучаснай Польшчы вялізарная большасьць насяленьня ня польская. Дык і ўся справа **АБАРОНЫ** гэтых граніц прымае выразна і прынцыпова палітычны характар. Тое, што робіцца за чырвоным кардонам, дае яшчэ раз—можа ўжо і ў апошні раз—**нячувана памысныя магчымасьці для польскай палітыкі...** Ці выкарыстаюць гэтую нячувана карысную, як кажуць, канъюнктуру кіраўнікі сучаснай Польшчы дзеля вырашэньня асноўнай задачы польскай усходняй палітыкі—поўнага паразуменьня з сваімі тэрытарыяльнымі меншасьцямі, гэта ня толькі справа іх дзяржаўнага розуму, але можа і пытаньне ўсёй будучай Польшчы, як незалежнай дзяржавы».

Аналёгічныя мэты ставіць і беларуская эміграншчына. «Бюлетэнь заграничнай групы беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянэраў» (№ 2 1925 г., Прага) выступаючы супроць аграрнай праграмы КП(б)Б, заяўляе:

«Сялянства зьяўляецца адзінаю вызыскоўваемаю працоўнаю клясай—работнікаў для зямлі, усе спробы бальшавікоў адкрыць «буржуазную сутнасьць» супрацоўнай сялянскай гаспадаркі, падзяліць сялянства на кулацкае, серадняцкае і бядняцкае—ёсьць беспадстаўныя маючыя на мэце хіба толькі адно—разьбіць клясавую еднасьць сялянства, пашырыць узаемную варожасьць».

Беларускія эсэры, выразна, выступаючы ў абарону кулака на БССР, даводзяць далей, што неабходна дабіцца «радыкальных зьмен існуючых парадкаў» і даюць спосаб як іх дабіцца, а менавіта: **«Неабходна захапіць у рукі палітычную ўладу ў дзяржаве, ці іначэй кажучы—стварыць незалежную беларускую дзяржаву».**

Рэч нямінучая, што беларускія нацыянал-дэмакраты, якія пастаянна перакліканцца з беларускім нацыянал-фашызмам і зьяўляюцца рупарам польскага фашызму, якія косьць ад косьці тэй-жа групы беларускіх фашыстаў, якія разам з Луцкевічам прымалі контр-рэвалюцыйнае хрышчэньне ў баёх супроць Кастрычнікавай рэвалюцыі, што і яны душой і целам за ваенную праграму нацыянал-фашыстаў, што і яны рыхтуюць збройную інтэрвэнцыю з боку польскага фашызму, што і яны рыхтуюць зброю на зваленьне Савецкай улады.

Калі прасачыць шляхі беларускай буржуазеі, якімі яна ішла пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі, дык чырвонай ніткай праходзіць **кіруючая роля беларускіх нацыянал фашыстаў з яе важаком Луцкевічам.** Гэта трэба тлумачыць тым, што асноўная сацыяльная база беларускай контр-рэвалюцыі знаходзіца на ЗБ, што там беларуская буржуазея мае найбольш сільныя палітычныя групоўкі, што там знаходзіца такі палітычны асяродак, як Вільня, дзе найбольш старыя традыцыі руху беларускіх заможных клясаў. Да ўсяго гэтага трэба дадаць яшчэ знаходжаньне такога пакладзістага апякуна і дабрадзея, як фашысцкая дыктатура.

Як падае той-жа эсэраўскі «Бюлетэнь» (1926, № 5) Віленскі беларускі цэнтр на чале з Луцкевічам у 1918—20 г. **вядзе маншахты з нямецкім шпікам З.оземелем і выдатным нямецкім манархістам д-рам Гравенгофам.** Водлуг слоў таго-ж «Бюлетэня»: **«А. Луцкеіч пастараўся нагаварыць сяброў рады БНР паслаць імпэратару Вільгэльму ўдзячную тэлеграму за вызваленьне Менску ад бальшавікоў. Гэту тэлеграму рэдагаваў уласнаручна А. Луцкевіч, але падпісаць адмовіўся з тае прычыны, што ён мусіць падобную тэлеграму паслаць тансама ад беларускай рады ў Вільні».**

Той-жа Луцкевіч **«пасылаў прывітальную тэлеграму генэралу Дзянініну ў 1919 г., калі той падыходзіў да Арла і жадаў яму посьпехаў пры змаганьні з бальшавікамі»** (Бюлетэнь 1926 г., № 5, Прага).

У 1920 г. **«Е. Ладноў ужо як французкі шпіён быў запрошаны А. Луцкевічам** (які ў той час быў прэм'ерам міністраў Беларускай народнай рэспублікі!—А. С.) **на выпаўняючага абавязкі міністра абароны ўраду БНР, і далей «А. Луцкевіч так падстроіў, што кніга Е. Ладнова была выдадзена пад фірмай Беларускага нацыянальнага камітэту ў Варшаве».** Кніга, аб якой ідзе тут гутарка, напісаная контр-разьведчыкам Е. Ладновым, пад загалоўкам «Огнем и мечом, голодом и болезнями», была выдадзена ў 1923 г. і зьмяшчала ў сабе супроць бальшавікоў самыя дзікія буржуазныя паклёпы і выдумкі, на якія здольна была толькі французкая ахранка.

Віленскі цэнтр беларускага нацыяналістычнага лягэру некаторы час пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі складаўся з самых выдатных і заслужаных «дзеячоў за беларускую народную рэспубліку», як Краскоўскі, Смоліч, Дубейкоўскі, Пракулевіч і інш., а ўсе пад камандай таго-ж Луцкевіча, прымаючы актыўны ўдзел ва ўсіх яго контр-рэвалюцыйных махінацыях. Але ўжо да 1925—26 г.г. ізноў-жа такі пад нацыскам і кіраўніцтвам **«Віленскага краёвага цэнтру»**, як кажа «Бюлетэнь Рады Беларускай Народнай Рэспублікі» (Прага, 1926, № 1), ідзе перагрупоўка беларускіх нацыяналістычных сіл, як на ЗБ, так і на эміграцыі. Вочы гэтага цэнтру зьвернуты ў гэты час на Менск, дзе, як падае той-жа «Бюлютэнь»: **«Уся палітычная і эканамічная праца ў Савецкай Беларусі вядзецца чужынцамі, элемэнтам прышлым, нічога супольнага з Беларуссю ня маючым».**

Апэрэтачны ўрад БНР, знаходзячыся ў Празе чэскай, атрымаў з Вільні:

«пастанову Краёвага Цэнтру ад 11-га лютага 1924 году, дзе прапанавалася спыніць працу ўраду... і запаняць намітэт, які-б зьвязаўся з Лігай Нацый, а ўсім арыентавацца на ўсход, пакінуўшы для культурнай працы ў Ліцьве Ластоўснага».

Як бачым, так званая ліквідацыя ўраду БНР ішла таксама па загаду з Віленскага Краёвага Цэнтру і што зьменавехаўства і пакаянныя заявы сяброў гэтага ўраду былі зроблены таксама з санкцыі Краёвага Цэнтру, інакш кажучы—пана Луцкевіча. Той-жа «Бюлетэнь» рады БНР ужо пасьля ліквідацыі ўраду піша, што **«духоўная і рэальная сувязь паміж прэзыдыумам рады і беларускім народам, нягледзячы на варожныя акупацыі, не парвана».** Рэч зразумелая, што за пакаяннымі заявамі хаваўся падзел роляў у адной і тэй-жа контр-рэвалюцыйнай рабоце і што «арыентацыя на ўсход», аб якой упамінае Краёвы Цэнтр», мела на мэце паслаць сваіх людзей у Савецкую Беларусь, каб «палітычную і эканамічную» працу праводзіць рукамі гэтых людзей, праводзіць антысавецкую контррэвалюцыйную працу па рэстаўрацыі капіталізму ў БССР.

Аб супольнасьці мэт і задач беларускіх нацыянал-фашыстаў і беларускіх нацыянал-дэмакратаў і аб тэй місіі, якая ўзложана на нацыянал-дэмакратаў у БССР праз усю беларускую буржуазею, выразна кажа пілсудчыкаўская газэта «Кур'ер Віленскі» ад 24 верасьня:

«Аднак, бязумоўна, яна (нацыянальная палітыка КП(б)Б — А. С.) спрыяе беларускай інтэлігенцыі ў справе нацыянальнага ўсьведамленьня шырокіх мас хоць-бы пад маскай камунізму, які праз тую ж інтэлігенцыю ўжываецца, як пераходнае зьявішча, з якім трэба мірыцца пад прымусам і выкарыстоўваць яго курс псэўда-фэдэралістычнай палітыкі з мэтай нацыянальнага ўсьведамленьня шырокіх пластоў. З гэтых унутраных, якбы кансьпірацыйных тэндэнцый значнай часткі беларускай інтэлігэнцыі, якая працуе на Савецкай Беларусі, ствараецца паміж ёй і беларусамі ў Польшчы вядомая духоўная сувязь, сваяцтва ідэалаў, якія неабходна вельмі старанна адрозьніваць ад уплыву сапраўднакамуністычных».

Ужо гэтага шэрагу фактаў дастаткова, каб з усёй вачавіднасьцю адзначыць ролю беларускіх нацыянал-дэмакратаў тут, у БССР, як агентаў усебеларускай буржуазеі і кулацтва, як рэалізатараў «усходняй палітыкі» польскага імпэрыялізму, а значыць дапаможнікаў і міжнароднага імпэрыялізму ў арганізацыі ўзброенага нападу на СССР і ў справе рэстаўрацыі капіталізму ў краіне пралетарскай дыктатуры.

(Працяг будзе).

*) Гл. «Віц. Прал.» №№ 230, 233.

Увязаць партыйную вучобу з практычнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва

Адчыненьне вячэрняга камвузу — новая перамога на фронце партасьветы нашай партарганізацыі

Выканаць пастанову ЦК аб задачах партасьветы

Пастанова ЦК УсеКП(б) «Аб задачах партасьветы», апублікаваная ў „Правде" ад 16-га верасьня, зьяўляецца, бясспрэчна, палітычнай дырэктывай, маючай агульнапартыйнае значэньне. Пастанову ЦК павінны ведаць усе культработнікі, увесь кіруючы актыў, уся партыя.

Наша партыя заўсёды расцэньвала партыйную асьвету як сродак для выхаваньня новых кадраў рэвалюцыянэраў у духу марксызма-ленінізма, як форму кіраўніцтва для рэвалюцыйнага дзейнічаньня.

Уменьне «зьвязваць у адно, штодзённы вопыт рэвалюцыйнай барацьбы з ўсёй справай пралетарскай рэвалюцыі, з «вопытам рабочага руху ўсіх краін, узятым у яго агульным выглядзе» (Сталін) з рэвалюцыйнай тэорыяй—вось чаго дабіваецца ад кожнага партыйца, ад кожнага рабочага і калгасьніка партыйная прапаганда. І зусім зразумела, што кажучы аб задачах партасьветы зараз—у пэрыяд вялічэзнага напружаньня ўсіх сіл партыі і краіны ў барацьбе за выкананьне пляна сацыялістычнага будаўніцтва, за чоткую партыйную лінію, за кадры—ЦК патрабуе ад усёй партыі «далейшага разгортваньня сеткі партыйнае асьветы і павышэньня яе марксысцка-ленінскага ўзроўню».

Пастанова ЦК прыводзіць сыстэму партасьветы ў становішча мабілізацыйнай гатоўнасьці да барацьбы за вырашэньне «канкрэтных задач партыйнай арганізацыі на прадпрыемстве і ў вёсцы».

ЦК патрабуе ад сеці партасьветы работы «па ўцягненьню мас у справу выкананьня прамфінпляну 3-га году пяцігодкі, разгортваньню калгаснага і саўгаснага будаўніцтва, — узмацненьню работы з беднатой, правядзеньню пасеўных кампаній, барацьбе за зьніжэньне сабекошту і рацыяналізацыі вытворчасьці, палепшаньню арганізацыі снабжэньня і інш».

„Увязка з практычнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва—гаворыцца ў пастанове ЦК —павінна зьяўляцца адным з важнейшых пачаткаў работы ўсяе партыйнае асьветы.

У прамой адпаведнасьці з пастановай ЦК сетка партасьветы павінна пакласьці ў аснову сваёй работы рашэньні 16-га зьезда партыі і звароту ЦК УсеКП(б) ад 3-га верасьня. Гэта адзначае, што **сетка мабілізуецца на вывучэньне, прапаганду і актыўны ўдзел у рэалізацыі рашэньняў зьезда і ЦК. Слухачы школ павінны асабістым прыкладам паказаць узоры ўдарнай работы; павінны быць у ліку ініцыятараў сустрэчнага прамфінпляну і іншых відаў сацспаборніцтва, павінны арганізоўвацца брыгады, вядучыя па заданьнях партарганізацый барацьбу за палепшаньне снабжэньня і г. д., і г. д.** Толькі пры такім становішчы можна казаць аб тым, што сетка партасьветы выканала сваю задачу, выхавала камуністых, умеючых на практыцы рэвалюцыйнай барацьбы прымяняць баявыя палажэньні марксысцка-ленінскай тэорыі. Толькі пры такой пастаноўцы работы можна гаварыць аб тым, што сетка па-сапраўднаму працуе над рашэньнямі 16-га зьезда.

Пастанова ЦК ускладае на сець партасьветы новую адказную задачу падрыхтоўкі кадраў актыву для ўсёй сыстэмы партыйнай работы.

Справіцца з усімі стаячымі перад ёю задачамі, сетка партасьветы зможа толькі тады, калі к яе рабоце будзе прыцягнута ўвага ўсёй партыі.

ЦК патрабуе: **«устанавіць сыстэматычнае штодзённае кіраўніцтва і праверку становішча партыйна-прапагандысцкай работы з боку партыямітэтаў».**

Гэтае кіраўніцтва павінна быць накіравана, у першую чаргу, на забесьпячэньне сеці ўстойлівымі прапагандысцкімі кадрамі і разгортваньне тэй разнастайнай сыстэмы партасьветы, якая прадугледжана пастановай ЦК.

Павінна быць таксама арганізавана адпаведнае **камплектаваньне сеці**, забесьпячэньне яе **памяшканьнямі, падручнікамі і г. д.**

Па ўсіх праявах недапусьцімай палітычнай недаацэнкі ролі партыйнай прапаганды павінен быць нанесен сакрушаючы ўдар. Пастанова ЦК павінна стаць цяжкой зброяй партыі ў гэтай барацьбе з коснасьцю, вузкім, па сутнасьці праваапартуністычным, дзяляцтвам, за марксысцка-ленінскую тэорыю—выпрабаваную зброю партыі ў яе барацьбе.

Больш увагі павышанаму зьвяну вучобы

Рашэньнямі 16-га партзьезду перад кожнай партарганізацыяй пастаўлена задача шырокага разгортваньня марксысцка-ленінскай вучобы ў партыі, далейшага павышэньня тэарэтычнага ўзроўню партыйцаў і беспартыйнага рабочага актыву. Павінна быць узмацнёна ўся наша палітычна-выхаваўчая работа ў арганізацыі, пад напрамкам яшчэ больш ідэёвага ўзбраеньня партыі супроць усялякіх ухілаў ад Ленінскай лініі, супроць праваапартуністычнай ідэалёгіі і «левай» фразэалёгіі. Добраякасна пастаўленая партыйная марксысцка-ленінская вучоба зьяўляецца аднымз лепшых сродкаў барацьбы з клясавым ворагам на ідэалёгічным фронце, і ў той-жа час, адным з пэўных шляхоў у галіне падрыхтоўцы новых, узброеных ведамі, кадраў, для нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Вось чаму ў пастанове ЦК УсеКП(б) ад 3-га верасьня рашуча асуджаецца назіраючаяся ў некаторых арганізацыях недаацэнка палітычнага значэньня партасьветы і паводле гэтай пастановы арганізацыі павінны **„прыняць усе неабходныя меры да яго пашырэньня і палепшаньня якасьці партыйнай вучобы".**

Практычным крокам у справе пашырэньня відаў вучобы па нашай гарадзкой арганізацыі зьяўляецца адкрыцьце ў Віцебску **сталага вячэрняга камвузу.** Гэтая ўстанова поўнасьцю адпавядае паказаньню ў вышэйпрыведзенай пастанове ЦК, што **„сетка партыйнай асьветы, асабліва яе сярэдні і павышаныя зьвеньні, павінны атрымаць больш выразную ўстаноўку на падрыхтоўку кадраў партыйнага актыву для розных галін партыйнай работы".**

Менавіта, выходзячы з гэтай устаноўкі, будзе будавацца работа вячэрняга камвузу. Зьмяшчаемы ніжэй расклад яго работы гаворыць, што поруч з павышэньнем ведаў слухача камвузу, па таму ці іншаму прадмету, будзе аддана вядомая колькасьць часу для прапрацоўкі пытаньняў бягучага моманту, для абгаварэньня і ўзьвядзеньня іх на прынцыповую вышыню, для разьвязваньня тых праблем, якія зьяўляюцца актуальнымі на данным рашаючым этапе.

Камвуз, як гэта відаць, ахопіць тых, хто мае веды ў аб'ёме 2-гадовай вячэрняй саўпартшколы, г. зн., што асноўным кантынгентам ВУЗ'у зьявяцца больш менш падрыхтаваныя таварышы, якія змогуць сваю практычную работу ў нізавой сетцы (гурткаводы, прапагандысты, камбінатчыкі), увязаць з далейшым павышэньнем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўня. Такі шлях з аднаго боку дасьць магчымасьць забясьпечыць нізавую сетку кіраўнікамі і выкладчыкамі, якія сыстэмасычна будуць узьнімаць сваю кваліфікацыю. З другога боку камвуз павінен з той часткі слухачоў, якія заняты на кіруючай рабоце (гаспадарнікі і інш.) выхаваць такіх палітычных працаўнікоў, якія ў сваёй практычнай рабоце будуць здольны праводзіць генэральную лінію партыі. Яны ўзброяцца той марксысцка-ленінскай тэорыяй, якая дае «сілу арыентыроўкі, яснасьць пэрспэктывы, упэўненасьць у посьпехах сваёй справы".

І гэта зусім зразумела. Тыя складанейшыя і адказьнейшыя задачы, якія зараз стаяць перад партыяй, рабочай клясай, патрабуюць выразнай і чоткай работы ал кожнага з нас на любым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта ставіць задачу скарыстаць усё магчымае, каб забясьпечыць з самага пачатку нармальныя ўмовы для работы камвузу —кузьні кадраў. Тыя недахопы, якія мы маем у працы нізавой сеткі з самага пачатку заняткаў, зьяўляюцца недапушчальнымі і павінны быць зараз-жа рашуча ліквідаваны, тым больш гэта абавязвае нас стварыць належныя ўмовы для работы такой важнейшай партыйнай установы, якой зьяўляецца камвуз.

Забясьпечаньню пасьпяховай работы камвузу,—гэтага павышанага зьвяна партвучобы,—парт'ячэйкі, усе грамадзкія арганізацыі, кожны партыец і рабочы актывіст, павінны аддаць выключную ўвагу і штодзённа дапамагаць яму ў рабоце, памятаючы, што практыка без тэорыі—гэта пусты гук. Ленін гаварыў: «Без работы, без барацьбы—книжное знание коммунизма из коммунистических брошюр и произведений ровно ничего не стоит, так как оно продолжало бы старый разрыв между теорией и практикой, тот старый разрыв, который составлял самую отвратительную черту старого буржуазного общества».

Узброенная ленінскімі ведамі, наша партарганізацыя з яшчэ большымі посьпехамі будзе змагацца з усялякімі ўхіламі ад генэральнай ленінскай лініі партыі, з бальшавіцкай непрымірымасьцьцю будзе біць па праваму апартунізму і «левым» загібам, дасьць руйнуючы адпор вялікадзяржаўнаму шавінізму і нацыянал-дэмакратызму.

Я. Р—н.

Усім райкомам КП(б)Б

Культпроп ЦК КП(б)Б прапануе ўсім ГК і РК, якія яшчэ не зрабілі заказу выдавецтвам на падручнікі для сеткі партыйнае асьветы, тэрмінова даслаць заказы на беларускія падручнікі Белдзяржвыдавецтву, а на расійскія—Бел. аддзяленьню Дзяржвыдавецтва РСФСР у Маскоўскай броні ЦК КП(б)Б.

БДВ выдае для сеткі партыйнае асьветы наступныя падручнікі:

1) Кержэнцаў—«Памятка бальшавіка».
2) Кержэнцаў і Лявоньцьцяў—«Азбука Ленінізму».
3) Альхова—«Азбука Ленінізму».
4) Лапідус і Астравіцянаў—«Палітэканомія ў сувязі з тэорыяй савецкае гаспадаркі».

Апрача гэтых падручнікаў у БДВ ёсьць леташнія выданьні:
Яраслаўскі—«Гісторыя УсеКП(б), частка 1-я і 2-я.
Шапавалаў і Майзель—«Нарысы па гісторыі КП(б)Б».

Пры здачы заказаў на літаратуру неабходна выслаць аванс выдавецтвам за лік сродкаў, асігнаваных па райбюджэце на партасьветы.

Нам. заг. культпропам ЦК КП(б)Б **С. Будзінскі.**

Выканаць прамфіплян вучобы

16-га кастрычніка ў Віцебску пачынае сваю працу вячэрні камвуз. Парадак яго работы, рэкамэндацыйны сьпіс літаратуры, час працы прыймовай камісіі,—зьмешчаны ніжэй.

Некалькі заўваг перад пачаткам работы камвузу. Сярод пэўнай часткі партыйцаў ёсьць думка, што пры наяўнасьці нашай сеткі партасьветы, камвуз з яго 12-дзённымі заняткамі будзе некалькі вялікай нагрузкай для асноўнай масы слухачоў. І адсюль робяцца вынікі, што досыць будзе займацца 6 раз у месяц.

Першапачатковы праэкт вячэрняга камвузу і выходзіў з такой устаноўкі. Але ў такім выглядзе камвуз ня меў бы таго сталага віду, якога мы павінны былі б чакаць ад такой установы. Пры шасьцідзённай рабоце ў месяц, наўрад ці ўдалося-б нам прайсьці тую праграму, якая прадугледжана для камвузу наогул, для вячэрняга ў прыватнасьці. Пры першапачатковым праэкце мы фактычна мелі-б не камвуз, а так званую паглыблёную вячэрную саўпартшколу.

Пагэтаму рашэньнем Гаркому ад 7-га кастрычніка камвуз прымае сталы від і будзе працаваць кожныя 2—3 дні з такім разьлікам, каб ён фунцыяніраваў ня менш 12 дзён у месяц.

Можна згадзіцца, што заняткі камвузу будуць прахадзіць у даволі напружаных умовах, але хіба ўся наша праца ў рэканструкцыйным перыяд ня носіць такі характар. Работа на вытворчасьці, на палёх, характарызуецца такім-жа тэмпам. Мы зьяўляемся сьведкамі нябачных тэмпаў працы па выкананьні гаспадарчых задач, якія сталі магчымымі дзякуючы нячуванаму энтузіязму, з якім рабочая кляса ў саюзе з асноўнымі масамі сялянства, пад кіраўніцтвам партыі, іх выконвае з тэй-жа напружанасьцю, з якой выконваецца прамфіплян на вытворчасьці, павінен выконвацца прамфіплян і вучобы. Толькі так падыходзячы да гэтай задачы (што даволі выразна паказана ў лісьце ЦК УсеКП(б)— «Правда» ад 30 га верасьня № 270), будзе забясьпечана пасьпяховая работа камвузу.

Другая заўвага наконт адносін самі́х слухачоў да камвузу. Ад іх у большай частцы будзе залежыць плянавая і бесьперабойная работа гэтай установы. Уцяміўшы, што камвуз зьяўляецца адказьнейшым вучасткам на фронце партасьветы, які стварае кадры выхавацеляў на павышэньню тэарэтычнага ўзроўню арганізацыі, слухачы камвузу павінны стаць прыкладам дысцыпліны ванасьці для слухачоў усёй сеткі. Яны павінны будуць паказаць новыя формы і мэтады вучобы (эстафеты спаборніцтва, узяцьце на буксір адстаючых школ), якія будуць спрыяць пасьпяховай і чоткай рабоце вячэрняга камвузу.

Расклад работы вячэрняга камвузу

Вячэрні камвуз працуе 6 мес. 12 дзён 4 гадз—288 гадзін.

Вячэрні камвуз мае 3 цыклы: эканамічны, гістарычны і гістпарт.

Расклад прадметаў па цыклах наступны:

Эканамічны цыкл

1-ы год навучаньня

а) Эканомгэаграфія—56 гадзін.
б) Палітэканомія—180 гадзін.
в) Бягучыя пытаньні—52 гадз.

2-і год навучаньня

а) Эканомпалітыка—184 гадзіны.
б) Гістмат—100 гадзін.
в) Бягучыя пытаньні—52 гадзіны.

Гістарычны цыкл

1-ы год навучаньня

а) Гісторыя клясавай барацьбы — 196 гадзін.
б) Эканомгэаграфія—40 гадз.
в) Бягучыя пытаньні—52 гадз.

2-і год навучаньня

а) Гісторыя сацыялізму—164 гадз.
б) Гістмат—120 гадз.
в) Бягучыя пытаньні—52 гадз.

Гістпарт—цыкл

1-ы год навучаньня

а) Гісторыя партыі—180 гадз.
б) Партбудаўніцтва—56 гадз.
в) Бягучыя пытаньні—52 гадз.

2-і год навучаньня

а) Ленінізм—154 гадз.
б) Гістмат—120 гадз.
в) Бягучыя пытаньні—52 гадз.

Бягучая палітыка праводзіцца ва ўсіх цыклах адначасова лекцыйным шляхам.

Вячэрні камвуз будзе займацца 4, 6, 9, 11, 14, 16, 19, 21, 24, 29 кожнага месяца.

Камвуз разьлічваецца на партыйцаў, камсамольцаў і беспартыйных рабочых актыў, маючых веды ў аб'ёме 2-гадовай вячэрняй саўпартшколы.

Кіруе цыкламі прафэсура з Менску.

Асыстэнты: эканом-цыклу — **Ламдзен**, гістарычнага—**Сараеў**, гістпарт-цыклу—**Бжозэ** і **Рубінчык**.

Дацэнт камвузу—**Рабіновіч**. Рэктар камвузу—**Рубінштэйн**.

Камвуз разьлічан на 100 слухачоў. Памяшканьне камвузу—Дом камасьветы.

Неабходная літаратура для вячэрняга камвузу

1. Па эканамічнаму цыклу

Лапідус і Астравіцянінаў—«Палітэканомія. **Кауцкі** — «Экономическое учение К. Маркса». **Маркс**—«Капітал.

2. Па гістарычнаму цыклу

Лукін—«Гісторыя Заходняй Эўропы. **Арк-Ан** — «Гісторыя Заходняй Эўропы і ПАЗШ». **Фрыдлянд і Слуцкі**—«Хрэстаматыя». **Маркс**—«18-е Брумэра». **Маркс**—«Грамадзянская вайна ў Францыі». Кніга для чытаньня па гісторыі Захаду, том III.

3. Па гістпартаўскаму цыклу:

Папоў—«Гісторыя партыі». Дзесяцітомнік Леніна. **Карпаў і Фліцмер** — Хрэстаматыя. 5 камплектаў поўнага збору твораў Леніна. **Сталін**—«Вопросы ленінізма».

Прапагандыстыя вячэрняга камвузу

а) Эканамічны цыкл—
Эканомгеаграфія **Беккер**
Палітэканомія **Ламдзен.**

б) Гістарычны цыкл
Гісторыя кляс. барацьбы—**Сараеў** і **Рабіновіч**

в) Гіспарт-цыкл—
Гісторыя партыі—**Рубінчык** і **Бжозэ.**
Партбудаўніцтва—**Рубінштэйн.**

Да ведама слухачоў вячэрняга камвузу

Прыймовая камісія абвяшчае ўсіх падаўшых заявы ў камвуз, што разгляд анкет і заяў будзе вытвараццa 12 кастрычніка, а 2 гадзіне дню, у памяшканьні культпропу Гаркому.

Усім падаўшым заявы (апрача скончыўшых школу прапагандыстаў) зьявіцца да гэтага часу ў пакой № 7 Гаркому КП(б)Б.

Культпроп Гаркому КП(б)Б.

Сарвалі другі дзень вучобы

У камбінаце-школе абутковай фабрыкі 7-га кастрычніка марксысцка-ленінскі гурток не займаўся. Зьявіўся толькі адзін чалавек, а ў школе 1-й ступені зьявіліся 8 чал., у падрыхтоўчай групе—15. Да заняткаў прыступілі з спазьненьнем роўна на гадзіну. Шафро.

Ад рэдакцыі. Парт'ячэйка абутковай фабрыкі! Першы дзень партвучобы ў вас сарваўся таму, што ў гэты дзень вы пачалі разьмяркоўваць ордэры. Адкажэце, чаму вы другі дзень сарвалі?

Будаўнікі, цагельнікі і міліцыя сарвалі першы дзень партвучобы

У вучэбным камбінаце 1-га раёну з прымацаваных прадпрыемстваў павінны былі зьявіцца 185 чалавек, а зьявілася—24. Зусім не зьявіліся з цагельнага заводу, будаўнікоў, з міліцыі і інш. савецкіх устаноў. Кіраўнікі ўсе зьявіліся. Вось вынік слабай растлумачальнай працы з боку партыйных ячэек гэтых прадпрыемстваў і устаноў.

Мядзьведзеў.

ЗАДАЧЫ ПАРТЫЙНАЕ АСЬВЕТЫ на 1930—31 навучальны год

Пастанова сэкратарыяту ЦК КП(б)Б ад 1 кастрычніка 1930 г.

1. У выніку недаацэнкі некаторымі партыйнымі арганізацыямі значэньня партыйнае асьветы, як зброі змаганьня за генэральную лінію партыі, у 29—30 г. назіраўся значны адсеў у сеткі партасьветы, а ў некаторых мясцох і поўны зрыў партвучобы.

Нават і там, дзе партвучоба праводзілася, партшкола не зьяўлялася застрэльшчыкам у барацьбе з ухіламі ад генэральнай лініі партыі, мала мабілізоўвала слухачоў на змаганьне з «левымі» перагібамі ў галіне калектывізацыі, на выкрыцьцё нацыяналістычных ухілаў, ня здолела ў выстарчальнай меры ўвязаць партвучобу з практычнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва (выкананьне прамфінпляну, пытаньні ўдарніцтва і г. д.).

2. Ва ўмовах разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце і абвастрэньня клясавай барацьбы ў краіне, пры ўзросшай актыўнасьці рабочае клясы і бядняцка-серадняцкіх мас насельніцтва, якая выявілася ў новых формах барацьбы за сацыялістычную арганізацыю работы (сустрэчны прамфінплян, грамадзкі буксір, вытворчыя манэўры і г. д.), пры нячувана шпаркіх тэмпах індустрыялізацыі краіны, сацыялістычнае рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, павароту партыі да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнае калектывізацыі, роля і палітычнае значэньне масавае партыйнае асьветы, як аднэй з важнейшых зброй у змаганьні за генэральную лінію партыі, значна ўзрастае.

3. Асноўны зьмест партыйнае вучобы на бліжэйшы пэрыяд часу павінен вызначыцца наступнымі задачамі:

а) прапаганда пастаноў 16-га зьезду УсеКП(б), 13-га зьезду КП(б)Б і важнейшых пастаноў партыі;

б) выкрыцьцё і барацьба з буржуазнымі і дробна-буржуазнымі тэорыямі, тэорыяй і практыкай правага апартунізму, як галоўнай нябясьпекай на гэтым этапе, «левымі» загібамі, саюзьнікамі правага апартунізму, і з прымірэнцтвам да ўхілаў ад ленінскай лініі партыі;

в) растлумачэньне нацпалітыкі партыі, барацьба з вялікадзяржаўным, найбольш небясьпечным шавінізмам, з беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам—дапаможнікам інтэрвэнцыі, барацьба з нацыянал-апартунізмам і шавінізмам розных колераў і адценкаў;

г) асьвятленьне пытаньняў палітыкі, тактыкі і задач Камінтэрну ва ўмовах сусьветнага крызісу імпэрыялістычнай сыстэмы і новага рэвалюцыйнага ўздыму;

д) ажыцьцяўленьне непарыўнае сувязі партвучобы з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва, абярненьне ўсёй сеткі партвучобы ў зброю мабілізацыі партыйных і беспартыйных мас на актыўны ўдзел у правядзеньні важнейшых палітычных і гаспадарчых кампаній (выкананьне прамфінпляну, калектывізацыя, збожжазагатоўкі і г. д.).

ЦК КП(б)Б падкрэсьлівае неабходнасьць вызначэньня ў сетцы партасьветы ня менш 1/3 навучальнага часу пытаньням бягучае палітыкі.

4. ЦК лічыць, што галоўнымі задачамі партыйнае асьветы ў сучасных умовах павінны зьявіцца:

а) партыйна-палітычнае выхаваньне новых кандыдацкіх мас, якія ўліваюцца ў партыю, і шырокіх кадраў беспартыйнага актыву, у мэтах узмацненьня вярбоўкі ў партыю перадавых рабочых, работніц, калгасьнікаў, батракоў і вясковай беднаты;

б) павышэньне марксысцка-ленінскага ўзроўню ўсёй масы членаў партыі;

в) тэарэтычная падрыхтоўка шырокіх кадраў партактыву;

г) практычная падрыхтоўка кадраў партактыву для розных галін партыйнае работы.

5. ЦК у адпаведнасьці з пастановай ЦК УсеКП(б) ад 13 верасьня г. г. зацьвярджае наступную сыстэму партыйнае асьветы на надыходзячы навучальны год і лічыць, што пры пабудове сеткі партыйнае асьветы неабходна выходзіць з вытворчага прынцыпу, арганізуючы школы і гурткі непасрэдна на буйных прадпрыемствах, саўгасах і калгасах:

а) пачатковая і каротка - тэрміновая партшколы з 3—4 месячным навучаньнем у горадзе і ў вёсцы ў якасьці асноўнай формы партыйна-палітычнага выхаваньня членаў партыі, кандыдацкіх мас і партыйнага актыву з праграмай навучаньня, якая падводзіць слухачоў да ўразуменьня агульна-палітычных ведаў, праграмы партыі, абавязкаў членаў партыі на падставе вывучэньня актуальных, бягучых задач сацыялістычнага будаўніцтва і партыйнае асьветы.

Поруч з пачатковай школай, у якасьці нізавога зьвяна, практыкаваць газэтныя гурткі, каротка-тэрміновыя гурткі па прапрацоўцы асобных пытаньняў палітыкі партыі, каротка-тэрміновыя курсы ў зьвязку з правядзеньнем масавых, палітычных і гаспадарчых кампаній.

б) асноўнай формай сярэдняга зьвяна партыйнай асьветы лічыць двухгадовую вячэрнюю саўпартшколу з закончаным цыклам першага году навучаньня, разьлічаную на падрыхтоўку шырокіх кадраў нізавога актыву. Пры гэтых саўпартшколах неабходна арганізаваць у сельска-гаспадарчых раёнах каротка-тэрміновыя курсы, зьезды батракоў і вясковых камуністых, прыцягваючы на гэтыя курсы беспартыйны актыў;

в) для ахопу розных груп партыйнага актыву разгарнуць таксама сетку:

1) марксысцка-ленінскіх прадметных гурткоў, разьлічаных на сыстэматычнае вывучэньне партактывам паасобных тэарытычных дысцыплін;

2) гурткоў бягучае палітыкі павышанага тыпу;

3) тэматычных гурткоў паасобных тэарэтычных і практычных пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва і партыйнае работы;

г) для ахопу цэнтральнага кіруючага актыву скарыстаць у шырокім маштабе формы завочнай вучобы ІЧП, Камакадэміі, Ленінградзкі і Сьвярдлоўскі Камвузы, КУБ і г. д.;

д) у мэтах ахопу тэарэтычнай вучобай кіруючага раённага актыву,—арганізаваць у гарадох і раёнах сетку вячэрніх і дэкадных камвузаў і цыкл тэарэтычных лекцый і дакладаў;

е) арганізаваць пры Камвузе, Гомельскай саўпартшколе 3-месячныя курсы раённага і нізавога актыву якія-б стала дзейнічалі;

ж) разгарнуць работу Дому Партасьветы ЦК, разьлічыўшы на ахоп каротка-тэрміновымі курсамі (6—8 тыдняў) членаў ЦК, ЦКК, членаў бюро РК і сэкратароў буйных вытворчых калектываў.

ЦК зварачае асаблівую ўвагу ўсіх партарганізацый на неабходнасьць бесьперапыннага камплектаваньня ўсіх зьвеньняў у працягу ўсяго навучальнага году па меры вербаваньня новых таварышоў.

5. Адзначаючы нездавальняючае становішча тэарэтычнай вучобы кіруючага партактыву, ЦК зварачае ўвагу ўсіх арганізацый на задачу 100%-га ахопу марксысцка-ленінскай вучобай актыву, захоўваючы добраахвотнасьць выбару форм вучобы.

ЦК лічыць неабходным прадаставіць для заняткаў актыву, апрача поўнага выкарыстаньня дзён адпачынку, яшчэ да 5 вечароў у месяц.

6. Прызнаць неабходным навучальны год у нізавой сетцы партыйнае асьветы ў горадзе і ў вёсцы пачаць з 5-га кастрычніка, а ў сярэдніх і вышэйшых зьвеньнях—не пазьней 1-га лістапада.

Даручыць Культпропу ЦК распрацаваць, а фракцыі БДВ тэрмінова выдаць праграмы і падручнікі для сеткі партасьветы на беларускай і нацыянальных мовах, паставіўшы на зацьвярджэньне Сэкратарыяту ЦК сьпіс праграм і падручнікаў з вызначэньнем тыражу і тэрмінаў іх выхаду.

7. Прымаючы пад увагу цякучасьць прапагандысцкага складу ў сетцы партыйнае асьветы, ЦК прапануе РК замацаваць прапагандыстых за сеткай партасьветы на ўвесь навучальны год і не адрываць іх на іншыя работы.

У мэтах павялічэньня прапагандысцкіх кадраў пашырыць практыку вылучэнства прапагандыстых з ліку партыйцаў-рабочых і калгасьнікаў.

8. У зьвязку з ліквідацыяй акруговага зьвяна партыйнага кіраўніцтва, ЦК лічыць неабходным—рашучае ўзмацненьне кіраўніцтва партвучобай у раёне, укамплектаваньне лепшымі прапагандысцкімі кадрамі нізавой сеткі партыйнае асьветы і сыстэмы тэарэтычнае вучобы раённага партактыву.

9. ЦК прапануе РК і ГК рашуча палепшыць кіраўніцтва справай партасьветы, заслухоўваючы на бюро РК і ГК даклады аб камплектаваньні партсеткі, ходзе вучобы і выніках вучобы.

У дні вучобы ніякіх нагрузак тым, што займаюцца вучобай, не даваць.

10. Улічваючы палітычнае значэньне сваячасовага і поўнага разгортваньня і ўкамплектаваньня сеткі партыйнае асьветы слухачамі, ЦК даручае ГК, РК узмацніць кіраўніцтва кампаніяй па вярбоўцы ў партсетку, праводзячы спэцыяльныя сходы ячеек і сходы партактыву па пытаньнях вучобы.

Рэдакцыям цэнтральных і раённых газэт, шматтыражкам і насьценным газэтам забясьпечыць шырокае асьвятленьне ходу разгортваньня новага навучальнага году ў сетцы партыйнае асьветы.

У мэтах узмацненьня мэтадычнага кіраўніцтва партвучобай падцьвердзіць пастанову ўсебеларускай культпрапнарады аб арганізацыі партыйных габінэтаў ва ўсіх раёнах, на буйных вытворчых прадпрыемствах і аб арганізацыі Менскага Дому Камасьветы ў Цэнтральны Дом Камасьветы.

Дух лодырніцтва вон!

Кіраўнікі да заняткаў павінны рыхтавацца

Другі дзень вучобы вячэрняй зьмены на фабрыцы Лекерта прайшоў амаль што здавальняюча, але маюцца наступныя недахопы, якія трэба будзе выправіць. Зьявіліся на заняткі 60 асоб, а па сьпіську лічыцца каля 200 асоб. Гэта гаворыць аб тым, што грамадзкія арганізацыі недастаткова зьвярнулі ўвагу на партвучобу. Парт. і камсамольскі калектыў ня прымаюць ніякіх захадаў да тых партыйцаў і камсамольцаў, якія не наведваюць школу.

Недапушчальныя адносіны з боку кіраўніка да заняткаў. Тав. Шафранаў — кіраўнік 1-га курсу да лекцыі не падрыхтаваўся, і ўвесь час пагэтаму вучні пісалі запіскі, што яны нічога не разумеюць. Нават некаторыя вучні жадалі пакінуць заняткі. Але-ж загадчык школы выручыў—даў другую лекцыю, што зацікавіла вучняў і заняткі прайшлі добра.

Красьнік.

У Віцебскім раёне партвучобу яшчэ не пачалі

Ня гледзячы на тое, што з боку Віцебскага РК былі дадзены дырэктывы аб правядзеньні падрыхтоўчай працы сярод партыйцаў, камсамольцаў, членаў прафсаюзаў і калгаснага актыву з мэтай укамплектаваньня школ да гэтага часу яшчэ не паступілі зьвесткі з ячэек, што ставіць пад пагрозу сваячасовы пачатак навучальнага году па раёну.

РПБ да гэтага часу не разгарнула працу сярод членаў прафсаюзаў, нават не складзена прафсетка і асобныя зьвеньні саюзу не падрыхтаваны да правядзеньня гэтае работы.

Такія адносіны гавораць аб яўнай апартуністычнай недаацэнцы значэньня рэвалюцыйнай тэорыі, Таварыш Сталін у выступленьні на XVI зьезьзде УсеКП(б) сказаў:

— «Тэорыя, калі яна зьяўляецца сапраўднай тэорыяй, дае практычную сілу арыентыроўкі, яскравасьць пэрспэктыў, упэўненасьць у рабоце, веру ў перамозе нашае справы».

Ячэйкі, якія яшчэ не абгаварвалі дырэктывы РК наконт партвучобы, павінны зараз-жа прыступіць да гэтага, шырока прыцягваючы беспартыйны актыў з калгасьнікаў і бядняцка-сераднякцкай часткі вёскі.

Трэба разгарнуць працу з такім разьлікам, каб быў 100-проц. ахоп вучобай партыйцаў, камсамольцаў і беспартыйнага актыву.

Замскі.

Паведамленьне

Прызначаны на 10 кастрычніка

ПЛЕНУМ ЦК КП(б)Б

пераносіцца на 20-е кастрычніка г. г.

Сэкратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.

НІКОМУ НЯ УДАСЦА САРВАЦЬ

ПЕРАМОЖНУЮ БАРАЦЬБУ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ ЗА ПЯЦІГОДКУ Ў ЧАТЫРЫ ГАДЫ

Шкоднікаў-арганізатараў аварыі на лесазаводзе да суровай пралетарскай адказнасьці

АГОНЬ ПА АПАРТУНІСТЫХ—ЗДРАДНІКАХ ПАРТЫІ, ВОРАГАХ ПЯЦІГОДКІ

Ударны квартал бальшавіцкага штурму

Зараз ужо дастаткова выяўлен лосна - апартуністычны характар пусьні правых, быццам перанясеньне пачатку гаспадарчага году на 1 студзеня азначае адтэрміноўку дзл некаторых адстаўшых гаспадарнікаў, «не пасьпеўшых» выканаць даданае ім заданьне на другі год пяцігодкі. Тым ня менш ёсьць яшчэ людзі, якія разглядаюць здарыўшыйся у выніку гэтага перанясеньня, так званы, асобны праміжак-квартал (кастрычнік—сьнежань 1930 г.), як асабістую перадышку. Такія настроі павінны атрымаць самы бязьлітасны бальшавіцкі адпор. Пачаўшыйся квартал зьяўляецца не кварталам перадышкі, а ўдарным кварталам бальшавіцкага штурму.

Яшчэ няма канчатковых, на квартал, кантрольных лічбаў, але прыблізны агульны гаспадарчы плян намечаны з дастатковай яснасьцю. Усталёўлена квартальная праграма для Данбасу — 10027 млн. вуглю, тады, як за ўнесь мінулы год Данбас даў 36 млн. тон пры пляне ў 40 млн. тон. Мэталюргічныя заводы павінны выплавіць у гэтыя тры месяцы звыш 1/2 млн. тон чыгуну і звыш 1,8 млн. тон сталі. Выкананьне гэтай праграмы будзе азначаць буйны крок наперад і ўзмацненьне асноўнай базы індустрыялізацыі—вуглю і мэталю.

На гэтай базе адбудзецца далейшы рост машынабудаўніцтва. Аб'ядананьнямі ВСНГ намечан на асобы квартал па цяжкаму машынабудаўніцтву выпуск прадукцыі ў 83,9 млн. руб., што азначае рост амаль на 1/3 у параўнаньні з 4-м кварталам, скончыўшагася гаспадарчага году, і па сельгасмашынабудаўніцтву—150 млн. руб. (рост на 70 проц.). У бліжэйшыя месяцы крывая выкананьня пляну, прамысловасьцю у цэлым, кожным прадпрыемствам у паасобку, павінна паказаць няспыняючыйся ні на адну 5-дзённу рух угару. Паміж тым, зараз мы наглядаем некаторыя хістаньні і няўстойлівасьць у рабоце такіх буйнейшых прадпрыемстваў, як, напрыклад, дняпраятроўскія заводы імя Пятроўскага і Дзяржынскага.

Асобны квартал распачаты пад знакам ударніцтва. У азнаменаваньне першага ўсесаюзнага дня ўдарніка, «Правда», «Труд», «Рабочая газета», «За индустриализацию» і іншыя цэнтральныя газэты, па ініцыятыве ленінградзкага заводу імя т. Сталіна арганізавала ўсесаюзны конкурс на лепшае прадпрыемства, прамысловасьці, транспарту і сацыялістычнага земляробства па выкананьню заданьняў ударнага кварталу.

Усесаюзны конкурс зьявіцца генэральнай праверкай таго, як кіруючыя арганізацыі змаглі на практыцы рэалізаваць адозву ЦК і як глыбока яна прасачылася ў масы, цэхі, агрэгаты, шахты, забоі, руднікі і г. д. Друку ў конкурсе належыць кіруючая роля. «Уральский рабочий», «Рабочий путь», «Рабочий край, «Нижегородская коммуна» і іншабласныя краявыя газэты ўжо пачалі падрыхтоўку да конкурсу. Зусім правільна падышла да гэтай справы рэдакцыя «Уральского рабочего», падпарадкаваўшы ёй пачаты газэтай трохмесячны «паход за вопытам». Такое-ж паведамленьне атрымана ад газэты «Червоный ударник», якая ўключыла ў конкурс разгорнуты ёю масава чырвоназьвёздны паход.

У барацьбе за прамфінплян друк высунуў шмат новых формаў работы **арганізаваных актыўнасьцю мас** для вырашэньня стаячых перад прадпрыемствамі вялізных выторчых задач Усесаюзны конкурс служыць тым рэчышчам, куды натуральна ўліваецца ўся работа газэт у гэтай галіне.

Якую мэту мае конкурс? Выявіць лепшыя нашы прадпрыемствы прамысловасьці і транспарту (таксама, як і лепшыя саўгасы і калгасы) для таго каб іх вопыт, іхныя дасягненні перадаць другім. Розныя формы і мэтады масавай вытворчай работы газэт менавіта на гэтым павінны атрымаць праверку. І наш друк у цэлым на вопыце конкурсу павінен палепшыць і падняць на больш высокую ступень сваю работу, арганізатара мас для вырашэньня баявых задач нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Друк павінен быць на чале разгортваючайся шырокім фронтам барацьбы за перамогу цяжкасьцяў, за далейшыя посьпехі.

Партыя расцэньвае работу друку па таму, наскольки ён змог стаць на чале гэтае работы, стаць сапраўдным арганізатарам шырачэйшых мас, наскольки друк сапраўды па-баявому вядзе наступленьне рабочае клясы, дапамагае масам дабіцца новых і новых посьпехаў.

Таму ўвесь друк, пачынаючы ад цэнтральнай і канчаючы фабрычна-завадзкімі газэтамі, арганізацыяй конкурсу павінен стварыць моцны, дзіны пераможны фронт сацыялістычнага наступленьня ў барацьбе мас за пяцігодку ў чатыры гады, за суцэльную калектывізацыю СССР і за ліквідацыю кулацтва як клясы—за баявыя лёзунгі 16-га партыйнага зьезду.

Быць першым у конкурсе—«справа гонару» кожнага прадпрыемства. Адсюль гаспадарчыя кіраўнікі, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі павінны зрабіць адпаведныя вывады. Наша сацыялістычнае будаўніцтва,—разгорнутае наступленьне на капіталістычныя элемэнты працягваецца наўпрокі шалёнаму супраціўленьню ворагаў, наўпрокі ўсім наскокам правых і «левых» апартуністых на генэральную лінію партыі, наўпрокі ўсім апартуністычным хістаньням у паасобных зьвеньнях савецкага апарату і партыі.

Плян асобнага кварталу павінен быць выканан і перавыканан. Для гэтага трэба мабілізаваць масы, уцягнуць новыя мільёны ў сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, мабілізаваць нашы неабсяжныя ўнутраныя рэсурсы, узмацніць барацьбу з бюракратызмам і расхлябанасьцю, перабудаваць на справе работу ўсіх арганізацый на прадпрыемствах. Гэтая задача канкрэтна стаіць перад кожным прадпрыемствам, перад кожным саўгасам і калгасам.

Яна павінна быць вырашана.

(«Правда»).

Сьледуйце яго прыкладу

Замацоўваю сябе за Віцебскім аддзяленьнем Белдзяржбуду да канца пяцігодкі. Бяру на сябе абавязан прыкласьці ўсе сілы і веды на перамогу ўсіх цяжкасьцяй, якія сустракаюцца на шляху нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Выклікаю пасьледваць майму прыкладу інжынэрна-тэхнічных работнікаў Белдзяржбуду Менску, Віцебску, Гомля, Мозыра, Полацку і інш.

Інжанэр Марэнсні.

Аварыя на лесапільным заводзе № 13

Прастоі варштатаў чорнай істужкай цягнуцца на працягу двух апошніх кварталаў бягучага году на лесазаводзе № 13.

Злосныя прастоі варштатаў сарвалі прамфінплян. Стварыўся вялікі прарыў. Рабочая маса разам з усімі завадзкімі арганізацыямі была мабілізавана на ліквідацыю прарыва. Хваляй сацспаборніцтва і ўдарніцтва, творчым энтузіязмам рабочых завода прарыў к канцу 4-га кварталу быў у значнай ступені пакрыт. Недавыкананьне гадавога заданьня раўнялася 3 проц.

У рабочых узмацнялася ўпэўненасьць, што недавыкананы прамфінплян будзе пакрыт у бліжэйшы час і завод займе пачэснае месца побач з пралетарыямі іншых прадпрыемстваў, выканаўшымі і перавыканаўшымі свой прамфінплян.

Але новы ашаламляючы ўдар разразіўся над нашым заводам. Нябывалая, нячуваная катастрофа адбылася 3-га кастрычніка. Стальны 4-дюймовы вал з насаджанымі на яго шківамі сарваўся з падшыпнікаў. Разьляцеліся на кавалкі два цэгляных фундаманты, на якіх быў устаноўлен вал. Выбылі з строю адна рама і два зэймера. Ударнымі тэмпамі тэхнічная частка ўзялася за ліквідацыю аварыі. Справа ішла поўным ходам. Ужо адзін зэймер працаваў на маторы і на палову вырасьлі новыя фундаманты. Грамадзкая думка прасякнулася сьвядомасьцю:

— Нагонім—не здадзім.

Новая катастрофа 7 кастрычніка канчаткова дабіла завод і завод спыніўся. На 2-й трансмісіі раскалоўся фундамант, пагнуўся вал, разьляцеўся шкіў, разьбіўшы асколкамі рамны шкіў.

Неабходна тэрмінова дакладна расьсьледваць прычыны аварый. Завадзкой грамадзкасьці не ўпадаць у паніку, а мабілізаваць яшчэ раз усе сілы і энэргію на ліквідацыю вынікаў катастрофы. Сумленна і сьвядома не пакладаючы рук, за цэглу, за цэмент, за зубіла!

Новыя моцныя трансмісіі прывядуць у рух варштаты і толькі сацспаборніцтва і працдысцыпліна памогуць перамагчы ўсе цяжкасьці ў выкананьні прамфінпляну.

Кобелеў.

Ці ня шкодніцтва тут?

Лесазавод № 13 7-га кастрычніка, а 5 гадзіне ўвечары, з прычыны аварыі галоўнай трансмісіі застанавіўся

3-га кастрычніка, а 11 гадзіне дня, пасьля абедзеннага перапынку, з прычыны таго, што фундамант трансмісіі лесазавода № 13 расхістаўся, вырвала шкіў, які разьбіўся і выляцеў з трансмісыйнага ніжняга паверху, прабіўшы падлогу ў корпус завода і сагнуў вал, з-за чаго выйшлі з строю рама № 3 і два зэймеры.

Прынятымі мерамі ўдалося зэймер перавесьці на матор і завод працаваў на дзьве рамы і адзін зэймер.

7-га кастрычніка, а 5 гадзіне увечары, пры рабоце 2-ой зьмены, расхістаўся фундамант галоўнай трансмісіі, пры чым шкіў разламаўся, выляцеў і разьбіўшыся ўдарыўся аб шкіў рамы № 1, паламаўшы апошні. Завод спыніўся.

У гісторыі лесазавода гэтакіх аварый яшчэ ня было. Зьяўляецца вельмі загадачнай гэтая аварыя, на працягу такога кароткага часу прывёўшы завод да спыненьня.

Неабходны самае тэрміновае і дакладнае расьсьледваньне.

Неабходна выявіць вінаватых і прыцягнуць іх да адказнасьці. Маецца шмат падстаў думаць, што тут дзейнічала арганізаваная рука, што тут шкодніцтва. Адначасова з гэтым неабходна прыняць усе меры да таго, каб у самым тэрміновым парадку пусьціць завод у ход. Трэба безадкладна паправіць галоўны вал завода. Трэба пакуль будуць устаноўлены фундаманты, тэрмінова прыстасаваць дрыўляныя тумбы для ўстаноўкі шківаў і трансмісій.

Трэба магчыма рацыянальней скарыстаць рабочую сілу з тым, каб завод ня нёс такіх вялікіх накладных расходаў. Частку рабочых трэба пусьціць у адпачынак.

Ул. Рыжы.

Папярэдзіць астаноўку ф-хі „Прагрэс"

Віцебскай абутковай фабрыцы «Прагрэс» за недахопам сыраріны пагражае перабой у рабоце. Рабочыя ў сваім сустрэчным прамфінпляне на кастрычнік—сьнежань павялічваюць выпрацоўку на 11 проц. Але скурсындыкат ня прымае належных захадаў да сваячасовага снабжэньня фабрыкі сыравінай.

Неабходна сваячасова прыняць тэрміновыя меры.

Брыгадзір «Віцебскага Пралетарыя» Славін,

Недаацэнка значэньня мабілізацыі сродкаў—горшая праява апартунізму

У дні ўдарных тэмпаў безгаспадарча ляжаць на фабрыках і заводах запасы паўфабрыкатаў

БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ ГАРКАМІСІІ І КАМСОДАЎ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ ЗРЫВАЕ РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАЗЫКІ

Ліквідаваць запасы гатовай прадукцыі і матар'ялаў

Камісія ВСНГБ на працягу 10 дзён абсьледвала шэраг прадпрыемстваў па пытаньню мабілізацыі ўнутраных сродкаў вытворчасьці. Вынікі абсьледваньня кажуць аб тым, што шэраг прадпрыемстваў злачынна хавалі вялікія запасы каштоўнага матар'ялу і паўфабрыкатаў. Гэта стварылася таму, што галоўным чынам мяняўся асартымэнт выпрацоўкі, а таксама з прычыны адсутнасьці сталага вучоту на вытворчасьці. Побач з гэтым камісія выявіла значны запас другіх матар'ялаў, дапаможнага характару на фабрыцы «Дзьвіна» і «Чырвоны мэталіст».

Нягледзячы на шэраг паказаньняў і дырэктыў аб нармалізацыі матар'яльных запасаў, гаспадарнікі гэтага ня прытрымліваюцца і як вынік на шэрагу прадпрыемстваў стварыліся запасы гадавой прадкцыі.

На **акулярнай фабрыцы** выяўлен лішкавы запас тавараў, што складае 21 проц. да ўсёй колькасьці.

На **скурзаводзе** замест запасу 62 партыі скур, фактычна ў сярэднім скапляецца 76 партый скур. На **фабрыцы «Дзьвіна»** адсутнічала апэрацыйнае кіраўніцтва мабілізацыяй ўнутраных сродкаў. Тут выяўлена, што на складзе і на вытворчасьці скапіліся запасы востра-дэфіцытнага матар'ялу—скурных рамнёў. Напрыклад, выяўлена 112 мэтр. рамнёў у той час, калі ў год расходваецца 11 мэтраў. Рамні № 2 на фабрыцы зусім не расходуюцца, а выяўлена тут 98 мтр. Гаспадарнікі фабрыкі да мабілізацыі сродкаў вытворчасьці адносьліся фармальна і на фабрыцы не наладжана штодзённая работа па мабілізацыі ўсіх сродкаў вытворчасьці.

Возьмем, напрыклад, завод **«Чырвоны мэталіст»**. Запісі ў складзкіх кнігах адстаюць на 2—3 месяцы, а нармалізацыя запасаў на заводзе не праведзена. Побач з рэзкім дэфіцытам мэталяў на заводзе скапіўся запас матар'ялаў, якія ці зусім непатрэбны заводу, ці патрэбны ў меншай колькасьці.

Напрыклад, маецца 695 клгр. ліставой медзі, якая заводу зусім непатрэбна і другі год ляжыць без усялякага руху. Марынуецца таксама 2700 клг. картону, а гадавы расход яго 100 кілёграм. Гаспадарнікі заводу ня ўлічылі патрэбнасьці заводу ў чыгунным ломе і ад гэтага завод мае 70 вагонаў мэталю, што складае гадавы запас яго.

Адміністрацыя ня прыняла сваячасова мер да таго, каб ліквідаваць непатрэбныя запасы мэталю, які зараз зьяўляецца дэфіцытным і які патрэбен другім галінам вытворчасьці. Гэтыя запасы стварыліся на заводзе з-за зьмены канструкцыі выпрацоўкі і часткова з-за адсутнасьці разнарадак. Напрыклад, на 1-е кастрычніка на заводзе маецца 175 лябёдак, а атрымана нарадаў толькі на 40. Ёсьць і запас у 2500 акучнікаў, але ні сельгасзабясьпечаньне, ні другія арганізацыі не даюць заводу разнарадак.

Усе гэтыя моманты сьведчаць аб тым, што большасьць гаспадарнікаў дагэтуль ня ўцямілі вялізнага палітычнага значэньня мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў для выкананьня плянавых заданьняў і паскарэньня тэмпаў індустрыялізацыі краіны. Мы ні ў якім разе не павінны прапусьціць міма ўсёй грамадзкасьці пытаньне аб важнасьці мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Камісія ВСНГБ у сваіх выніках прапанавала гаспадарнікам **у самы кароткі тэрмін прыняць меры да ліквідацыі стваючыхся запасаў гатовай прадукцыі і матар'ялаў на вытворчасьці.**

Вакол пытаньня мабілізацыі ўнутраных сродкаў на выкананьне пяцігодкі неабходна мабілізаваць усю савецкую грамадзкасьць, усе партыйныя і прафэсыйныя арганізацыі з тым, каб усе вольныя рэсурсы кінуць на выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

С. Ф.

Гарадзкая камісія садзейнічаньня дзяржкрэдыту распушчана

Цэнтральная камісія садзейнічаньня дзяржкрэдыту заслухала справаздачу віцебскай гарадзкой камісіі садзейнічаньня аб распаўсюджваньні пазыкі—«Пяцігодка ў чатыры гады».

На паседжаньні высьветлілася, што раней падпіска па гораду дасягнула 88 проц., але зараз гэтая лічба аказалася дутай, бо як мясцовыя камсоды, так і аддзяленьне дзяржбанку давалі няправільныя лічбы. Фактычна плян рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—у чатыры гады» па Віцебску выканан усяго толькі на 72 проц.

Гарадзкая камісія садзейнічаньня ня мела падрабязных зьвестак аб ходзе распаўсюджваньня пазыкі і не кіравала працай камсодаў.

Цэнтральная камісія садзейнічаньня пастанавіла:

За бязьдзейнасьць распусьціць віцебскую гарадзкую камісію садзейнічаньня, паставіўшы пытаньне перад прэзыдыумам ЦВК аб прыняцьці належных мер да прэзыдыуму Віцгарсавету, які не сачыў за працай камісіі і аддзяленьня дзяржбанку.

Зводка аб ходзе рэалізацыі пазыкі „Пяцігодка—у чатыры гады" па Віцебскаму раёну на 30-е верасьня 1930 года

Агульная сума заданьня па раёну—108410 руб.

З іх сярод рабочых і служачых—56410 р.

Сярод сялян—52 тысячы руб.

Афармлена сярод рабочых і служачых—29415 р.

Паступіла грашыма ў лік падпіскі—2870 р.

Атрымана сельсаветамі для распаўсюджваньня сярод сялян—36935 р.

Атрымана грошай 5860 руб.

Перабудаваць работу гарадзкой ашчадкасы

У працы віцебскай гарашчадкасы буйнейшы прарыў. Ашчадкаса не мабілізавалася для актыўнага выкананьня адозвы ЦК УсеКП(б), не актывізавала сваю працу, у выніку чаго і не дабілася 100-процантнага выкананьня ўсіх сваіх заданьняў. Кантрольныя лічбы па ўкладах выкананы па быўшай Віцебскай акрузе ўсяго толькі на 65 проц., процант выкананьня кантрольных лічбаў па гораду зусім невядомы, бо і самога заданьня на горад Віцебск ня было. Падпіска на пазыку «Пяцігодка—у чатыры гады» не закончана. Афармленьне падпіскі ідзе вяла, а грашовыя паступленьні зусім мізэрны. Замест 3—4 узносаў, зроблена ўсяго толькі 1—2. Безнаяўныя разьлікі за 5 месяцаў існаваньня з месца ня зрушыліся. Па вэлёабавязацельствах становішча ня лепшае—трэцяя сэрыя рэалізавана ўсяго толькі на 65 проц., чацьвёртая—на 20 проц., а тэрмін рэалізацыі канчаецца 15 кастрычніка.

Самая брыдкая гэта—запазычанасьць па 3-й пазыцы індустрыялізацыі, якая па ашчадкасах горада складае 80 тыс. руб. (г. зн. паловы ўсёй запазычанасьці ўсіх ашчадкас БССР). Найбольш значныя даўжнікі—«Мэтпром» № 3—11234 руб., абутковая імя «Лекерта»—3054 руб., акулярная—2254 руб., групком № 1—5082 руб., групком прызатных прадпрыемстваў—1547 р., гаврабачком зямлеса—1134 руб., ф-ка «Дзьвіна»—2670 руб., і нарэшце групкомы акрвыканкому—2209 руб. і акругкому—КП(б)Б—1600 руб.

Прыведзеныя лічбы аб запазычанасьці па 3-й пазыцы кажуць аб тым, што камсоды і прафарганізацыі бязьдзейнічалі. Дапамогі ў працы гарашчадкасе ні з чыйго боку ня было. Мясцком гарашчадкасы да апошняга дню ня ведаў аб прарыве і толькі займаўся «ўвязкай», «вывучэньнем» пытаньня і шматлікімі паседжаньнямі. Партыйная ячэйка работала толькі па «пляну» [illegible] кастрычніка ўжо ведаючы аб тым, што ў гарашчадкасе прарыў, [illegible] нас па пляну дакладаў у ашчадкасе няма. 25 кастрычніка заслухаў справаздачу ашчадкасы і [illegible] гаворым. А то, што дзяржава недаатрымала на будаўніцтва 90.000 руб., толькі па 3-й пазыцы і ашчадкасах г. Віцебска, гэта відавочна ячэйкі не датычыцца. Аб увазе і кіраўніцтве гарашчадкасай з боку партыйных, прафэсыянальных і савецкіх арганізацый сьведчаць наступныя факты. На 50—60 работнікаў ашчадкасы маецца ўсяго толькі 1 член КП(б)Б і 3 камсамольцы.

Гарком КП(б)Б, ведаючы аб становішчы гарашчадкасы, 4-га кастрычніка заявіў: «з кадрамі дрэнна, зараз даць людзей ня можам, дамо ў плянавым парадку. Дамо, а калі невядома». А пакуль прарыў расьце.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што прычынамі прарыву зьявіліся, як слабасьць работы гарашчадкасы, так і адсутнасьць дапамогі і кіраўніцтва работай гаркасы з боку гарпрафбюро і гарсавету.

Неабходна зараз узмацніць апарат ашчадкас Віцебска членамі партыі і камсамольцамі. Усёй савецкай і прафсаюзнай грамадзкасьці неабходна тэрмінова ўстрахнуцца, вытварыць праверку выкананьня ўсіх дадзеных гарашчадкасай заданьняў і прыступіць да актыўнай, не на словах, а на справе, дапамогі ў рабоце кас і ўдзелу ва ўсіх яе кампаніях. На ашчадкасы ў сучасны момант ўскладаюцца надзвычайна важныя і адказныя задачы (разгортваньне сеці райкас, безнаяўныя разьлікі, абслугоўваньне сельбюджэта і інш.). Для хутчэйшай ліквідацыі прарыва і 100 процантнага выкананьня ўскладзенага партыяй і ўрадам на ашчадкасы заданьняў, неабходна тэрміновая перабудова работы гарашчадкасы, 100-процантная яе актыўізацыя і поўная і безагаворачная падтрымка ашчадкасы з боку партыйных, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый.

І. Захараў.

Да рабочых і сялян Савецкай Беларусі

Адозва маракоў Савецкага вайсковага флёту

Асабовы склад лінейнага карабля «Парыская Камуна», падшэфныя Ленінскаму камсамолу Беларусі, пасылае баявое чырвонафлёцкае прывітаньне рабочым і сялянам БССР і іх баявому атраду—Ленінскаму Камуністычнаму Саюзу Моладзі.

16-ы зьезд УсеКП(б), зьяўляючыся зьездам разгорнутага сацыялістычнага наступу па ўсяму фронту, асаблівую ўвагу зьвярнуў на справу абароны Савецкага Саюзу.

Скончыўшы летні пэрыяд вучэбнай баявой падрыхтоўкі, асабовы склад нашага карабля мае буйныя дасягненьні ў справе бальшавіцкага ўзмацненьня тэмпаў і падвышэньня баягатоўнасьці лінкора.

Галоўнае зьвяно марскіх сіл, якое аховае межы Савецкага Саюзу, адданы вартавы хлебнай Украіны і «чорнага золата»—вугля Данбасу і Закаўказья—лінкор «Парыская Камуна» моцны і баяздольны.

Адозва ЦК УсеКП(б) ад 3-га верасьня 1930 году зьяўляецца штандарам энтузіязму мільённых мас працоўных.

Чырвонафлётцы перакананы, што на гэтым баявым штандары рабочая кляса Беларусі, усе працоўныя, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, упішуць ударныя лічбы перамог перавыкананьнем плянаў трэцяга, рашаючага году пяцігодкі.

З пачуцьцём вялізарнай трывогі мы прачыталі ў газэтах, якія прыходзяць да нас з БССР, аб тым, што першыя дзесяць месяцаў гаспадарчага году далі значны прарыў у выкананьні прамысловасьцю БССР прамфінпляну.

Кожны нявыкананы процант прамфінпляну ёсьць удар па абароназдольнасьці краіны, удар па сацыялістычнаму будаўніцтву.

Пралетары Савецкай Беларусі!

Вы, у дні грамадзянскай вайны паказаўшыя, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, вузоры адданага рэвалюцыйнага гэраізму, не павінны дапусьціць удару па пяцігодцы.

Чырвонафлётцы і камандна-палітычны склад лінкора «Парыская Камуна» зьвяртаецца да вас з заклікам напружыць усе сілы на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Ленінскі камсамол Беларусі павінен быць на перадавых пазіцыях упартай, штодзённай і шырока разгорнутай барацьбы за прамфінплян, за яго выкананьне і перавыкананьне.

Выкананьнем прамфінпляну на прадпрыемствах, арганізацыйным узмацненьнем існуючых калгасаў, настойлівай работай па далейшаму прыліву ў калгасы батракоў, беднякоў і сераднякоў і ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, рашучым ажыцьцяўленьнем дырэктыў партыі па нацыянальна-культурнаму будаўніцтву, мы здолеем забясьпечыць правядзеньне ў жыцьцё гістарычных рашэньняў 16-га зьезду УсеКП(б).

Чырвонафлётцы і камандна-палітычны склад лінкора запэўняюць рабочую клясу БССР, што яны, у адказ на адозву ЦК УсеКП(б), яшчэ з большай адданасьцю і бальшавіцкай энэргіяй будуць змагацца за гэткую баявую падрыхтоўку, за гэткае ўзмацненьне абароназдольнасьці Савецкай краіны, якія забясьпечаць мірнае сацыялістычнае будаўніцтва.

Дарагія таварышы!

Пагроза нападу імпэрыялістаў на Савецкі Саюз рэальна. Перад намі стаіць задача з найбольшай нагрузкай выкарыстаць для сацыялістычнага будаўніцтва каштоўны час мірнай перадышкі.

Ленінскі камсамол Савецкай Беларусі на працягу шэрагу гадоў зьяўляецца шэфам нашага лінейнага карабля. Наша сувязь з камсамолам Беларусі мае бясспрэчныя дасягненьні. Але побач з дасягненьнямі неабходна адзначыць і шэраг буйных мінусаў у рабоце па шэфству: слабая пісьмовая і жывая сувязь. Ліквідуем данны прарыў, наладзім сувязь з камсамолам Беларусі і з усімі працоўнымі беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, якія знаходзяцца на мяжы з капіталістычным сьветам, і таксама як і лінкор, зьяўляецца адным вартавым Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Мы заклікаем рабочую клясу Беларусі быць у першых шэрагах ударнікаў, энтузіястаў сацыялістычнай будоўлі. Вядзеце жорсткую барацьбу з лятунамі, гультаямі, рвачамі, дызэртырамі з фронту сацыялістычнага спаборніцтва.

Праз некалькі дзён значная група чырвонафлётцаў 1904 г. нараджэньня будзе дэмабілізавана. Гэта група чырвонафлётцаў, атрадных ударнікаў, барацьбітоў за бальшавіцкія тэмпы індустрыялізацыі гораду і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі ўльлецца ў вашы шэрагі. Гэта—наш падарунак трэцяму году пяцігодкі. Дэмабілізаваныя чырвонафлётцы, людзі бальшавіцкай вывучкі, прайшоўшыя суровую школу рэвалюцыйнага карабля, атрымалі, пад кіраўніцтвам чырвоных камандзіраў, палітработнікаў і партыйна - камсамольскай арганізацыі моцную рэвалюцыйную загартаванасьць.

Пад сьцягам ударнага штабу сусьветнай рэвалюцыі—Камуністычнага інтэрнацыяналу — ўсе на барацьбу за сусьветны Кастрычнік.

Цьвярдзей замацуем дысцыпліну, ператворым сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ў мэтад нашай штодзённай вялікай работы.

Няхай жывуць працоўныя Савецкай Беларусі і іх баявы атрад—Ленінскі Камсамол.

Няхай жыве камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі—кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва БССР.

Няхай жыве Усесаюзная Камуністычная Партыя.

Урачыстыя абяцаньні аб сувязі з флётам віцебская камсамолія слаба выконвае

8 год таму назад у кіно «Спартак» адбыліся ўрачыстыя провады першага атраду камсамольцаў, пасланых у флёт. Гэта было як раз пасьля 5-га зьезду, калі камсамол прыняў шэфства над Чырвоным флётам.

Ад'яжджаючым таварышом ячэйкі друкароў, швэйпрому, панчошнай ф-кі давалі падарункі з сваёй вытворчасьці, а астатнія ячэйкі давалі тое, «хто чым багаты». Заклікалі мабілізаваных камсамольцаў апраўдаць шэфства над флётам і абяцалі з імі трымаць цесную сувязь.

Сьвежыя камсамольскія сілы павінны былі аздаравіць флёт, даць новыя кадры.

За апошнія гады флёт стаў амаль што камсамольскім. «Капітан камсамолец, качагар камсамолец, усе матросы камсамольцы»... як гэта пяюць камсамольскія песьні. Камсамол выканаў пастаўленую партыяй перад ім задачу. Але-ж трэба адзначыць, што гэтыя посьпехі нашай камсамольскай арганізацыі «ускружылі голаву». Сувязь з флётам, якая была даволі моцная ў першыя гады шэфства, у апошнія гады асабліва ў нашай віцебскай арганізацыі значна паслабла.

«Камсамольская Праўда» заклікае пачаць праверку шэфскай работы над флётам, арганізаваць збор шэфскіх 15 кап. за 1930 г., падарункаў і г. д., каб 8-я гадавіна з дню прыняцьця шэфства над флётам (16-га кастрычніка 1922 г.) зьявілася-б штуршком у ажыцьцяўленьні сапраўднага шэфства.

Віцебская арганізацыя на апошняй акруговай канфэрэнцыі давала ўрачыстае абяцаньне прадстаўніком флёту ўзмацніць сувязь з падшэфным караблём. Гэтае абяцаньне наша арганізацыя павінна выканаць. Ц.

ТЭЛЕГРАМЫ

Тт. Ціхоўскі і Бернштэйн зноў перад польскім судом

ВАРШАВА, 8. Сёньня ў Варшаве ў апэляцыйным судзе пачалася слуханьнем справа Ціхоўскага (быўшага сэкратара камфракцыі сойму) і Бернштэйна, прыгавораных судом першай інстанцыі да 8 год катаржнай турмы.

Польскія фашыстыя дзейнічаюць

ВАРШАВА, 8. «Кур'ер Цодаённы» паведамляе аб новых двух фактах падпалаў польскіх маёнткаў у раёне Львову. Адначасова газэта паведамляе аб масавых вобысках і арыштах у Збараскім, Перамышльскім і Гарадзельскім паветах. Уначы проці 7 кастрычніка зроблены масавыя арышты і вобыскі сярод украінцаў у ваколіцах Львову, а таксама ў памяшканьні «Просьвіты» і ўкраінскім каапэратыве.

Львоўская ўлада адмовіла ў хадайніцтве ўкраінскіх буржуазных дзеячоў аб сталай ахове ўкраінскіх установ, матывуючы сваю адмову, паміж іншым, «стамленьнем паліцыі». Арыштаван сэнатар Кузьмін (член Ундо).

Перагляд справы Рамана Білы

ВАРШАВА, 8. У вышэйшым судзе 27 кастрычніка будзе разглядацца касацыйная скарга ўкраінца Рамана Білы, прыгаворанага львоўскім судом к сьмерці за падрыхтоўку летась выбуху ў ва Львове.

Белы тэрор у Балгарыі ўзмацняецца

ВЕНА, 3. Як падаюць з Софіі, хваля белага тэрору ў Балгарыі з кожным днём усё больш і больш пашыраецца. У Эскі-Джумае паліцыя арыштавала двух рабочых, якія былі зьбіты ў охранцы да паўсьмерці.

У даліне Дабнік арыштавана 15 маладых сялян. На вёсцы Углен, каля Лукавіта, у памяшканьне, дзе адбываўся сход сялян, скліканы незалежным сялянскім саюзам, балгарскія фашыстыя, падтрымліваемыя паліцыяй, кінулі 4 ручных гранаты. Напад фашыстых выклікаў сярод сялян вялікае ўзбуджэньне.

30-га верасьня ў Сафіі слухалася справа рэдактара рабочай газэты Зьмітро Гяоргіева па абвінавачваньню ў распраўсюджваньні «антыдзяржаўных» лістовак. Гяоргіеў прыгаворан на 5 год турмы і к уплаце штрафу ў 50 тысяч лей. Падсудны сустрэў прыгавар фашысцкага суду словамі: «няхай жыве рэвалюцыя», «няхай жыве СССР».

За гэтую дэманстрацыю пракурор узбудзіў проці Гяоргіева новую справу.

Сялянскі рух у Грэцыі

ВЕНА. 3. Водле паведамленьня з Афін на мінулым тыдні ў Лагадзе (Грэчаская Македонія) адбылася вялікая антыўрадавая дэманстрацыя сялян. На нарадзе ў Салоніках дэлегаты, абраныя на сялянскіх сходах у Пелапанэсе, Фесаліі і Македоніі, пастанавілі весьці барацьбу проці ўраду ў ва ўсёй краіне. На нарадзе быў абран баявы камітэт, для арганізацыі сялянскіх дэманстрацый пратэсту проці ўраду.

Ангельскія войскі на тэрыторыі Афганістана

ЛЁНДАН, 8. З Дэлі паведамляюць, што ў раёне Курашу (паўночна-заходняя правінцыя) узьнік пагранічны канфлікт. Ангельска-індыйскія войскі занялі горныя пазіцыі на тэрыторыі, якую афганскі ўлад лічыць сваёй. Ангельцы адмовіліся задаволіць патрабаваньня мясцовай улады аб ачышчэньні тэрыторыі, паказваючы, што яна належыць Вялікабрытаніі.

Праэкты барацьбы з беспрацоўем

ЛЁНДАН, 3. Лёйд Джордж сумесна з другімі лідэрамі ліберальнай партыі распрацаваў плян барацьбы з беспрацоўем. Плян будзе прадстаўлен ураду Макданальда праз некалькі дзён.

Газэта лічыць, што калі ўрад адхіліць прапановы лібэралаў, дык гэта паслужыць повадам к адмове лібэралаў ад далейшага падтрыманьня ўраду.

Беспрацоўе расьце

ЛЁНДАН, 8. Паводле афіцыйных дадзеных, зарэгістраваных беспрацоўных у Ангельшчыне на 29-га верасьня было 2162000 чалавек (на 52 тысячы больш чым сі ў прайшоўшы тыдзень).

Тэўфік-Рушдзі-бей аб сваёй паездцы у СССР

СТАМБУЛ, 8. Зьвярнуўшыся ў Турцыю Тэўфік-Рушдзі-бей у гутарцы з прадстаўніком друку заявіў: «Я зьвярнуўся з поўнай задаволенасьцю маёй паездкай у СССР. Шчырыя праўленьні сяброўства і сімпатыі з боку Савецкага ўраду кранулі мяне. Я заяўляю, што усе нашы перамаўленьні праходзілі ў атмасфэры ўзаемнага сяброўства. За час маёй паездкі я пераканаўся ў тым вялізным прагрэсе разьвіцьця прамысловасьці і другіх галін народнае гаспадаркі». Перамаўленьні паміж СССР і Турцыяй аб заключэньні гандлёвага дагавору працягваюцца і асноўныя пытаньні ўжо разьвязаны.

Грызьня кітайскіх генэралаў

БЕЙПІН, 8. У Цяньцзіне паміж прадстаўнікамі Мукдэну і Нанкіну ўзьнік канфлікт па пытаньню аб кіраваньні Цзян-Цзін-Пукоўскай чыгункай. Нанкінскі ўрад адмаўляецца перадаць кіраваньне дарогай Мукдэну. Прадстаўнік Нанкіну захапіў пячатку праўленьня дарогі.

Уведзена асаднае становішча

БЕЙПІН, 8. Выдаючаяся ў Цзянь-Цзіне кітайская газэта «Ішы-бао» паведамляе, што ў цэлым шэрагу раёнаў паўднёвага Хэбею-Ханьтань, Шундзе і Іншых, а таксама ў Вэйхуэй паўночнай Хэнані з поваду камуністычных выступленьняў уведзена асаднае становішча.

Сутычка паміж японскаю і кітайскай паліцыяй

ШАНХАЙ, 8. Як падаюць з Харбіна, у Луньцзіне (буйны горад ў акрузе Цзяндао Гірынскай правінцыі) 6 кастрычніка адбылася буйная сутычка паміж японскімі паліцэйскімі, ахоўваючымі японскае консульства і кітайскай паліцыяй. Двое забіты, некалькі чалавек паранена.

ПА САВЕЦКАМУ САЮЗУ

Нота савецкага ураду Чжан-Сюэ-Ляну

Урад СССР уручыў 7 кастрычніка маршалу Чжан Сюэ-Ляну ноту, у якой паказваючы на ўзмацніўшуюся дзейнасьць белагвардзейскіх банд у поўначы Манчжурыі, у прыватнасьці ў раёне Кіт.-Усх. чыгункі, заяўляе рашучы пратэст проці дзейнасьці белагвардзейцаў і патрабуе прыняцьця кітайскай уладай рашучых мер для ліквідацыі белагвардзейскіх арганізацый і банд.

Восенная сяўба на Украіне

ХАРКАЎ, 9. На 5-е кастрычніка на Украіне засеяна 6630 тысяч га, што складае 63 проц. заданьня.

Калегія Наркамзему Украіны прызнала такі стан сяўбы пагражаючым і патрабуе зараз-жа напружыць усе сілы, каб давыканаць плян. Калегія зьвярнулася да ўраду з просьбай прыцягнуць к суду старшынь пасяўных троек.

Новыя лесапрацоўчыя заводы

НОВАРАСІЙСК, 9. Пачалася вялікая работа па скарыстоўваньню лясного багацьця Чорнамор'я. У Дубку і другіх гарадох будуюцца дубільныя заводы, у Туапсэ распачата будаўніцтва буйное фанэрнае фабрыкі. Усяго па Чарнамор'ю мае пабудавацца 10 буйных фабрык і заводаў па пераапрацоўцы лесу.

Аб разьвіцьці саматужна-прамысловых арцеляў у калгасах

МАСКВА, 8. НКЗем СССР, Калгасцэнтр СССР вынесьлі пастанову, рэгулюючую ўзаемаадносіны паміж калгасна-каапэрацыйнай сыстэмай і сампрамкаапэрацыяй. Існуючыя прамарцелі і прамкрэдытныя таварыствы захоўваюцца ў ва ўсіх раёнах. Прамысловая і калгасна-каапэрацыйная сыстэма павінна паставіць сваёй задачай максымальнае разьвіцьцё саматужных промыслаў у калгасах.

У тых раёнах, дзе промыслы—асновы занятак мясцовага насельніцтва, мэтазгодна арганізаваць на дабраахвотных пачатках прамысловыя калгасы, абслугоўваючыя, як прамысловасьць, так і сельскую гаспадарку дадзенага раёну на аснове спэцыяльнага статуту.

Саматужнікі, што састаяць членамі прамысловых каапэратываў пры уступленьні ў калгасы абагульваюць сродкі сельска-гаспадарчай вытворчасьці і ўплачваюць уступныя ўзносы на агульных асновах. Саматужнікі, ня маючыя сродкаў сельска-гаспадарчай вытворчасьці, уплачваюць уступныя ўзносы як і рабочыя.

Стрэлачнік М. Сьцяпанаў папярэдзіў крушэньне

Адміністрація разьезду у Часнове каля Бранску накіравала пасажырскі цягнік, не дачакаўшыся прыбыцьця таварнага, на станцыю Бранск 2. Крушэньне папярэджана находчывасьцю стрэлачніка т. Сьцяпанава, пусьціўшага пасажырскі цягнік на другую лінію. Адміністрацыя разьезду аддадзена пад суд.

Сьнежная завея

ЛЕНІНГРАД, 8. У раёне Балагое пранясілася моцная сьнежная завея. Чыгуначны рух спынен бо шляхі занесены сьнегам.

Уборка соі

НОВАРАСІЙСК, 9. У ва ўсіх раёнах Чорнамор'я пачалася масавая уборка соі. У некаторых мясцох ураджай у два разы больш леташняга.

Паведамленьні

Пленум Гарсавету СВБ

14-га кастрычніка, а 6-й гадзіне ўвечары, у клюбе Гаркому КП(б)Б адбудзецца **пашыраны пленум гарадзкога савету саюзу ваяўнічых бязбожнікаў**. На пленум неабходна зьявіцца ўсім членам савету і сакратарам ячэек СВБ. Установы вылучаюць сваіх прадстаўнікоў.

Павестка дню: падрыхтоўка к перавыбарам ячэек і калектываў СВБ і далейшыя перспэктывы работы.

— З 10-га кастрычніка, з 12-ці да 7-мі гадз. увечара, у быўш 3-м магазыне (рог Вагзальнай і Канатнай вул.), будзе праводзіцца прымацаваньне пайнікаў да зачыненага разьмеркавацеля—рабочых швэйных фабрык №№ 1, 2 і 3.

— Прымацаваньне пайнікаў чыгуначнікаў к зачыненаму разьмеркавацелю будзе вытварацца да 10 га кастрычніка. Пасьля паказанага тэрміну выдача прадуктаў не прымацаваным пайнікам вытварацца ня будзе.

— **Сёньня, у памяшканьні БДТ-1 а 4-ай гадзіне дню, адбудзецца паседжаньне мастацка-палітычнай рады Першага Беларускага Дзяржаўнага Тэатру.**

Да ведама рабкораў, ад'яжджаючых на выстаўку

Усе рабкоры, вылучаныя ФЗМК і рэдэлегіямі для паездкі на Усебеларускую сельска-гаспадарчую выстаўку, павінны сёньня, а 9-й гадзіне раніцы, зьявіцца ў рэдакцыю для паездкі ў Менск.

Культмасавы сэктар.

— Віцебскі Белпэдтэхнікум паведамляе, што прыём заяў на 1-ы курс Белпэдтэхнікуму працягнут да 15-га кастрычніка.

— Па пытаньню зьместу і пляну мэтадычнай працы склікаюцца наступныя настаўніцкія вытворчыя аб'яднаньні:

11-га, а 6 г.—групаводы 1 груп: 1) дакладчык—бюро аб'ядн., 2) «навучаньне грамаце»—т. Каліноўскі.

11-га а 8 г.—выкладчыкі фізмат. дакл. Собаль, Абрамовіч, Салоха.

12-га, а 6 г.—групаводы 2 груп дакладчык—т. Няразік.

12-га, а 8 г.—выкладчыкі прыродазнаўства, дакл. Ціханаў і Крывашэя.

14-га, а 8 г.—выкл. мовы і літаратуры сацвыхову, палітасьветы прафшкол і ФЗУ, дакладчыкі—Арлоўскі і Піліпаў.

Незьявіўшыяся тт. павінны будуць даць **тлумачэньне аб прычынах сваёй адсутнасьці**

Арганізацыя фотарабкораўскага гуртка

З 6-га кастрычніка пры рэдакцыі газэты «Віцебскі Пралетары» пачаў функцыяніраваць **фотарабкораўскі гурток**.

Усе рабкоры, жадаючыя займацца, павінны запісацца ў масавым сэктары рэдакцыі.

Масавы сэктар.

Да ўсіх членаў і кандыдатаў Гарсавету

Зараз па гораду ідзе кампанія па давыбарах у Гарсавет. Праца Гарсавету на працягу амаль усяго часу слаба асьвятлялася ў друку. Рэдакцыя газэты «Віцебскі Пралетары» зварочваецца да ўсіх членаў і кандыдатаў Гарсавету асьвятляць у газэце працу Гарсавета і яго сэкцый, а таксама і ход правядзеньня давыбараў.

Культмасавы сэктар газэты «Віцебскі Пралетары»

Нарада шэфскага актыву

11-га кастрычніка, а 6 гадз. увечары, у памяшканьні Палацу працы (пакой № 25) склікаецца **нарада шэфскага актыву.**

Запрашаюцца ўсе члены акруговага праўленьня «Культзмычкі» старшыні МА «Культзмычкі», увесь шэфскі актыў, старшыні ФЗМК і загадчыкі культ. масавымі сэктарамі па рабоце ў вёсцы.

Парадак дню:

1. Справаздача штаба аб ходзе ўборачнай кампаніі.
2. Аб перавыбарах МА «Культзмычкі».
3. Рознае.

У віду важнасьці пытаньняў—яўка для ўсіх абавязкова і без спазьненьняў.

— 11-га кастрычніка, а 6 гадз. увечары, у памяшканьні Гаркому КП(б)Б (пакой № 6) адбудзецца паседжаньне агітмасавага сэктару Гаркому КП(б)Б па пытаньню аб ходзе перавыбарнай кампаніі дэлегацкіх сходаў і аб ходзе калдагаворнай кампаніі.

Павінны зьявіцца загадчыкі масавых сэктараў, бюро калектыва і прарт'ячэек, жанарганізатары, кіраўнікі дэлегацкіх сходаў: Трутнёва, Гіндзіна, Картуз, Маран, Поль, Чарнямордзік, Кейф, Багдановіч, Перцоў, Шукарэнка, Глушакова, Якерсон, Папкова, Бляхман, Левіна, Пескіна—ад Гарпрафсавету—Кабішчар, Гарсавету Пінкіс, Гарком—КСМ—Смолікава, ад «Дзьвіны»—Раманоўскі, «Прафінтэрн»—1 Брук.

Сэкратарам парт'ячэек забясьпечыць яўку вышэйпералічаных таварышоў.

— 11-га кастрычніка, а 6-ай гадзіне ўвечары, у памяшканьні Палацу працы (пакой 22), склікаецца **нарада культмасавага сэктару Гарпрафсавету,** з павесткай дню: 1. Плян правядзеньня дню ўраджаю і калектывізацыі. 2. Стварэньне лектарскага бюро пры Гарпрафсавеце. 3. Пераход кінопрадпрыёмстваў на зьменную работу і работа міжсаюзнага яўгэйскага хору.

Яўка для культработнікаў фабкомаў абавязкова. Запрашаюцца ўсе навуковыя работнікі і дабрахвотнікі, прымацаваныя к культсэктару.

Усім піанэрам і школьнікам

13-га кастрычніка, а 6-й гадз. увечары, у памяшканьні Белдзяржтэатру адбудзецца паказ **«Мост»** для піанэраў і школьнікаў, у сувязі з сустрэчай 3-х гарадоў—Магілеў, Ворша і Гомель. Усім атрадам і школам трэба загатовіць білеты.

Білеты па зьмяншоных цэнах будуць прадавацца ў гарбюро ДКА.

Апошні тэрмін здачы авансаў

Праўленьне ЦРК паведамляе ўсе фабзаўкомы і каапупаўнаважаных аб тым, што сёньня гранічны тэрмін здачы авансаў на тавары.

Пагэтаму да 6 гадз. увечары 10-га кастрычніка павінны быць канчаткова зроблены ўсе разрахункі з ЦРК і прадстаўлен канчатковы сьпіс тавараў, на якія атрыманы авансы.

Пасьля гэтага тэрміну прыём авансаў спыняецца і тавары будуць перададзены іншым прадпрыемствам.

Аб дні выдачы ордэраў будзе аб'яўлена асобна.

— Віцебская Біржа працы (сэкцыя падлёткаў) паведамляе ўсіх беспрацоўных і састаячых на вучоце Біржы працы падлёткаў аб тым, што сёньня, у 4 гадзіны дню, у памяшканьні сэкцыі падлёткаў назначаецца агульны сход усіх беспрацоўных падлёткаў па пытаньню пасылцы на работу.

Незьявіўшыяся на сход будуць лічыцца не адзначанымі за кастрычнік.

На 12-га гэтага кастрычніка, а 6 гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу «Прафінтэрн» (Ленінская, 10) склікаецца агульны сход **беспрацоўных** саюзу **саўгандлслужачых** па пытаньню:

Аб пасылцы беспрацоўных на працу і перакваліфікацыі адстаючых спэцыяльнасьцяй.

Яўка ўсіх беспрацоўных абавязкова і без спазьненьня.

Адначасова з гэтым будзе ўтворана адзнака па беспрацоўю і больш потым адзнака рабіцца ня будзе.

Гарпраўленьне саюзу саўгандлслужачых.

№ 1568—3—1

Общее собрание врачей

Сегодня, 10-го октября, в 9 ч. веч., в клубе «Медработник», состоится общее собрание научной ассоциации врачей.

Повестка дня:

1. Профотбор, его методы и задачы, доклад д-ра Б. М. Шапиро.
2. Информация пред. правления д-ра Л. О. Якерсона о его докладе на Всебелорусск. правлен. научных ассоциаций 28 сент.

Правление.

Чс. вык. аб. адк.
рэдактара Ул. Дуброўскі

ЦЫРК (т-ва „Прыхільнікі дзяцей") Сёньня, у пятніцу, 10-га кастрычніка, **ВЕЧАР**—пародый, сатыры і гумару **Н. П. Зінін і Паўля Эрліх.** Сёньня **Н. П. Зінін** упяршыню выступіць з сатыраю, фэльетонным абазрэньнем і пародыямі.

1-ы БЕЛДЗЯРЖТЭАТР. Сёньня, 10 кастрычніка, НЕАДКЛАДНА АДБУДЗЕЦЦА **ВЕЧАР СЬМЕХА УЛАДЗІМЕРА ХЕНЬКІНА** пры ўдзеле іншых артыстых
Пачатак роўна а 9 гадзін увечары.
Бялеты—ў касе тэатра

Гартэатр. ГАСТРОЛІ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ пад кіраўніцтвам Б. В. Бэнэдыктава.
Сёньня, 10-га кастрычніка,
ЧОРНЫ АМУЛЕТ
у 3 дзеях, муз. Стрэльнікава.
Бялеты—ў касе тэатра. Пачатак роўна а 8 гадз. увеч.

БЕЛДЗЯРЖКІНО 3 панядзелка, 6-га кастрычніка
СПАРТАК Пачатак 1-га сэан. а 6 г. 30 хв. **Цьверды характар** мастацкі фільм.
МАСТАЦКІ Штодзённа 4 сэансы, Пач. 1 сэан. абг. Новы замежны фільм вытвор. Лео-фільм **КАХАНЬНЕ МАРАКА** драма ў 7 част.
ПРАЛЕТКІНО Пач. 1-га сэансу роўна а 6 гадзін. Нашум. карціна з цыркавога жыцьця **СЬМЯРОТНАЯ ПЯТЛЯ** ў 8-мі частках.

ВИТГОСРЕЧФЛОТ сообщает, что с 10-го октября изменяется впредь до отмены движение пароходов по нижнему плесу.
ЕЖЕДНЕВНОЕ ОТПРАВЛЕНИЕ:
из Витебска на Бешенковичи в 9 часов,
из Бешенковичи на Витебск в 6 часов.
ВИТГОСРЕЧФЛОТ.
1564—1—1

6-му отдельному производителю работ ГЛАВДОРТРАНСА ТРЕБУЮТСЯ ЖИЛЫЕ ДОМА свободные от жильцов в черте города.
С предложениями продажи обращаться в контору работ постройки Луческого моста. Телефон 5-18. Почтовый адрес: Витебск, вокзал, Прорабу 6.
15 52—1—3

ЦЫРК (т-ва „Прыхільнікі дзяцей") СЭНСАЦЫЯ! На-днях **МЕРТВАЯ ПЯТЛЯ**
1566—1—1 Падрабязнасьці ў афішах.

15-га кастрычніка ісцякае апошні тэрмін **ПАДПІСКІ НА ВЭЛЕСЫПЭДЫ** III і IV сэрыі.
Рассрочка выплаты па велёсыпэдам:
III сэрыі да 1-га красавіка 1932 г.
IV „ „ 1-га жніўня 1932 г.
ПАДПІСКА АТРЫМАЕЦЦА ва ўсіх гарадзкіх і раёных ашчадкасах.
Гарадзкая ашчадкаса № 32.
1563—3—1

ЦЫРК таварыства „Прыхільнікі дзяцей". Пач. а 9 гадзін. Канфэрансье І. В. Лебедзеў (дзядзя Ваня).
Сёньня, 10-га кастрычніка, ВЯЛІЗАРНАЯ **НОВАЯ ПРАГРАМА:** Марыя і Александр Шырай, Н. П. Зінін і Паўла Эрліх з ЧАЙЧЭНКА, з ЦАСГЕЙ, 2 БУРТОНС, дрэсыроўшчык Том з сабачкай, БАЯКОЎСКАЯ.

Згублены і ўкрадзены ніжэйпаказаныя дакументы, якія лічыць несапраўднымі:
Дакументы Ф. І. Баброва 417
Паявая кніжка № 454 М. Шмаравай 419
Сяброўскі білет саюзу сельгаслесрабочых № 80921 З. І. Лосева 418
Вайсковая вучотная кніжка В. Баравіка 420
Конская картка, выд. на імя Т. Чукова 421
Паявая кніжка П. І. Сікунова 422
Саюзны біл. № 0383961 В. Басенка 423
Пашпарт № 322 І. Н. Амбросава 425
Пасьведчаньне аб нягоднасьці да ваеннай службы № 263 С. Д. Нахамчына 426
Сяброўская кніжка саюзу саўгандслужачых С. Д. Нахамчына 427
Учотная конская картка Какаева К. В. 428
Асабовая вайсковая кніжка Друнчанка І. М. 429
Камсамольскі білет за № 23279 Ноўкіна М. Д. 431
Паявая кніжка за № 416 Шыпуля Х. З. 432
Паявая кніжка Бешанкавіцкага спажывецкага т-ва Шарснёва С. С. 433
Сяброўская кніжка Астровенскага спаж. т-ва за № 2114 Сакалоўскага І. Ф. 434
Конская картка Рубенкова І. Т. 435
Пасьведчаньне аб сканчэньні курсаў кіраўнікоў Зянько 436
Каап. кніжка Янавіцкага спаж. т-ва за № 604 Баранава А. Т. 437
Паявая кніжка за № 335 Язева А. Ф. 439
Паявая кніжка за № 1374 і к ёй кніжка Высачанскага спаж. т-ва Кузьняцова С. Е. 440
Паявая кніжка Янавіцкага спаж. т-ва за № 616 Вашнеўскага А. Р. 441
Пасьведчаньне асабовасьці Рабаковай М. А. 442
Паявая кніжка Сураскага спаж. т-ва за № 1502 Галаўнёва С. А. 433
Каапэр. кніжка за № 219 Смольскай П. К. 444
Асаб. вайсковая картка Гратвол Г. І. 445
Каап. кніжка Гарадоцкага спаж. т-ва за № 683 Е. А. Зьвержынскай 457
Пасьведчаньне асабовасьці М. А. Наўменка 446
Даведка аб праве голасу С. Кусельсона 447
Паявая кніжка Чашніцкага спаж. т-ва за № 2018 Ф. Сведзюца 448
Пасьведчаньне асабовасьці, выд Елагінскім с/с, В. Кваткоўскага 449
Асаб. кніжка запасн. чырвон. Балтыйск. флёту І. Е. Машэра 450
Камсамольскі білет за № 76254 В. Нікалаенка 451
Кніжка, выд. Пагоньцішчанск. ОП за № 14, В. Нікалаенка 452
Прад. дзіцячая кніжка, выд. Чашніцк. ОП, на імя П. Берсьценява 453
З паяв. кніжкі Гарадоцкага спаж. т-ва М. Рыбакова 454
Заборн. кніж. № 2 і 3 І. К. Сьпірыдонава 456
Паявая кніжка Пустынскага спаж. т-ва М. А. Гоманавай 458
Паявая кніж. Межанскага спаж. т-ва за № 757 А. О. Семашко 459
Паявая кніжка Чашніцкага ОП за № 328 П. Шаропіна 460
Паявая кніжка Сіроцінскага спаж. тва. за № 1465 Я. М. Максімава 470
Вайсковая кніжка В. Сьвіршчэўскага 471
Конская картка П. С Прудняченка 472
Інвал. дакумант П. В. Ізофатава 473
Паляўнічы білет за № 1493 П. С. Дробітава 474
Паявая кніжка Высачанскага спаж. т-ва за № 1297 Цэсарына 475
Пячатка Унаўскай арцелі «Безбожнік» 477
Вайсковы дакумант Б. Н. Бейлінсона 478
Пасьведчаньне асабовасьці Я. Ф. Кузьменкава 479
Вайсковы білет за № 95 А. В. Судакова 480
Квіток саюзу паляўнічых Зазіта В. П. 486
Конская картка Марчанка М. Г. 487
Паявая кніжка Янавіцкага спаж. т-ва за № 1834 Марозава Я. 488
Пасьведчаньне асабовасьці Лапухава Т. Ф. 489
Сяброўская кніжка Лёзьнянскага спаж. т-ва Зайцава К. Т. 490
Пасьведчаньне за № 153 Печонкіна І. С. 491
Паявая кніжка Сямёнава В. 492
Конская кніжка Корбана Н. В. 493
Уч. вайсковы білет Шмырава Е. А. 494
Паявая кніжка—Прывізіёнка А. 494
Вайсковы біл., пасьв. асаб. Масько А. 495
Пасьв. асабовасьці Лур'е Н. 496
Паяв. кніжка Міхеенкава П. 497
Паяв. кніжка Таруліна А. 498
Праф. кніжка рабз. Самохіна В. 499
Пасьв. асаб., ваенны білет Гушча С. 500
Паяв. кн. Зазыба 501
Паяв. кн. Гусакова Н. 502
Паяв. кн. Гарбунова М. 503
Пасьв. асабов. Калістратава 504
Паяв. кн. Іванова 505
Паяв. кн. Сініцына Г. 506
Пасьв. асабов. Пучкова М. 507
Паяв. кн. № 1773 Рудава А. 508
Замацав. талёны 3-й пазыкі № 05, сэр. 060789, 060790, 060786, 060791 Ялоўскай К. 509
Пасьведчаньне асабовасьці № 82 Н.-М. І. Наумоўскага 7821
Членская кніж. т-ва «Прыхільнікі дзяцей» А. Д. Баравіковай 7822
Сэзон. картка ЦРК Г. Д. Сілкіна 7824
Даведка Салікамскага здрав. аддз. К. Сіроткіна 7825
Пропуск паяч. ф-кі № 2079 Х. З. Скоблавай 7826
Пасьведчаньне асабовасьці З. Н. Катовіч-Бейко 7827
Сяброўскі білет саюзу дрэваапрацоўчыкаў № 2823 І. Н. Больмана 7828
Камсамольскі білет № 140421 І. Н. Больман 7829
Заборная кніж. ЦРК А. Т. Раманава 7830
Разавы праязны білет Масква—Віцебск і назад, выдадзены Мосчыгунораддзелам, В. А. Копіша 7831
Лекавая кніжка У. П. Мехавай 7835
Лекавая кніжка Г. М. Поласава 7836
Атэстат, выд. курс. ЦІТ'а С. М. Аврыціна 7837

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР. Сёньня, 10 кастрычніка, АДЗІНЫ **вечар АПАВЯДАНЬНЯЎ І ПАРОДЫЙ, САТЫРЫ І ЮМОРА Уладзімера ХЕНКІНА,** пры ўдзеле: сьпявачкі Іны Ровіч, артыстага сафіта С. Муравіна (скрыпка). у рамля А. Фінкэльштэйн
Пачатак роўна а 9-й гадзіне ўвечары.
Білеты прадаюцца ў касе тэатру з 12 да 2 гадзін і ад 5 да 10 гадзін увечары, і ў Палацы працы (кніжны кіёск) з 9 гадзін раніцы да 4 гадзін дню.
Па калектыўных заяўках **скідка 25 проц.**

Віцгарліт № 1. Друкарня «Камінтэрн», Бальшавіцкая. 10.